Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 14 (893) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 8 КРАСАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.

Кіраўнік аддзела культуры Прэзідыума ВРН у Беластоку А. Гжэськевіч на аглядзе «Беларуская песня — 73».

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

СТАІМ ПЕРАД ВЯЛІКІМІ ЗАДАННЯМІ

РАЗМОВА З КІРАЎНІКОМ АДДЗЕЛА КУЛЬТУРЫ ПРЭЗІДЫУМА ВАЯВОДСКАЙ РАДЫ НАРАДОВАЙ У БЕЛАСТОКУ АНТОНІМ ГЖЭСЬКЕВІЧАМ.

— Бягучы год багаты вялікімі здарэннямі ў культурнай дзейнасці ў краіне. Яны накрэсліваюць галоўныя напрамкі культурнай працы таксама на Беласточчыне.

— Найперш хочацца прыпомніць пастановы VI з'езду партыі, дзе гаворыцца пра раўнамернае развіццё грамадскага, гаспадарчага і культурнага жыцця. Трэба ўсімі сіламі старацца нам, каб гэтыя пастановы ператвараліся ў рэчаіснасць. Калі рэч ідзе пра агульнанародныя гадавіны, праўда, імі бягучы год багаты. Гэта Год Каперніка, Год польскай навукі, працяг святкавання 50-ай гадавіны ўтварэння СССР і вельмі важнае для нас здарэнне — Цэнтральныя дажынкі ў Беластоку. Адзначэннем 200-ай гадавіны Камісіі нацыянальнай адукацыі займаецца ў асноўным Куратория і беластоцкія вышэйшыя школы.

— Як Беласточчына ўключаецца ў агульнанародныя мерапрыемствы?

— У нас былі тры выстаўкі, прысвечаныя каперніканскай гадавіне, у тым ліку адна міжнародная. У Цеханоўцы ў маі адбудзецца папулярна-навуковая сесія, прысвечаная К. Клюку — вучонаму-прыродазнаўцы, чыё імя мае цеханоўскі музей. Сесія будзе арганізавана разам з Польскай акадэміяй навук. Багата прадстаўляецца святкаванне 150-ай гадавіны Аўгустоўскага канала — гэтага аб'екта прагрэсіўнай тэхнічнай думкі.

У святкаванні 50-ай гадавіны СССР цэнтральным мерапрыемствам у гэтым годзе былі нядаўнія дні дружбы з Літоўскай ССР.

З нашага боку раён прадстаўляе некаторыя мерапрыемствы агульнанароднага характару. Гэта фестываль «Музыка і паэзія» ў красавіку. У маі — фестываль жаўнерскіх тэатраў паэзіі, які спалучым з 30-ай гадавінай Польскага Войска. На Беласточчыне таксама адбываюцца кожны год тры міжнародныя мастацкія пленеры: разьбы ў дрэве ў Гайнаўцы, жывапісу — у Белавежы і жывапісу — у Аўгустове.

— І пра нашы дажынкі?..

Працяг на стар. 4

БГКТ ХРОНІКА

■ Нядаўна эстрадны калектыў гуртка БГКТ з вёскі Плёскі (Бельскі павет) даў канцэрт у сельскагаспадарчай спулдзельні ў Дарожках (Беластоцкі павет) і ў Беластоку ў «папраўчаку» для «трудных» дзяцей.

■ Гурток БГКТ у Васількове, што каля Беластока (старшыня гуртка Хведар Садоўскі) арганізаваў драматычны калектыў, які ўзяўся за падрыхтоўку п'есы «Міхалка». Ужо адбыліся першыя рэпетыцыі. Варта адзначыць і тое, што гурток атрымаў дазвол раз у тыдзень арганізаваць свае мерапрыемствы ў мясцовай святліцы.

■ 15 сакавіка пад кіраўніцтвам намесніка старшыні гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку Уладзіміра Паўлоўскага адбылася нарада актыву, на якой была выбрана новая рада клуба ў наступным складзе: Анатоль Казмерук (старшыня), Марыся Пракапюк (намеснік старшыні), Янка Ахрымюк, Анатоль Навіцкі, Уладзімір Сімаковіч, Валянціна Рубчэўская і Ірэна Врубэль. Новая рада апрацавала праект «рэгуляміну» клуба.

■ На Гайнаўшчыне вялікім зацікаўленнем карыстаюцца выдавецтвы Галоўнага праўлення БГКТ. Гайнаўскі аддзел БГКТ за апошнія два месяцы прадаў 1890 экземпляраў «Беларускага календара» на 1973 год, шмат экземпляраў кніжкі пад загалоўкам «БГКТ» і 95 грампласцінак з песнямі вядомага беларускага спевака Міхася Забэйды-Сумпіцкага.

■ 23 сакавіка прэзідыум гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку сустрэўся з радай клуба; супольна яны разгледзелі праект правілаў (рэгулямін) для наведвальнікаў клуба. Былі ўнесены да яго некаторыя папраўкі, а затым аднагалосна зацверджаны. Супольна таксама была падрыхтавана штотыднёвая праграма мерапрыемстваў на красавік і май. Члены прэзідыума аддзела пастанавілі на дзень 13 красавіка склікаць пленум аддзела, які дасць ацэнку дагэтуляшняй працы прэзідыума і накрэсліць заданні на бліжэйшы перыяд дзейнасці.

■ 23 і 24 сакавіка кінапрасоўскай ГП былі паказаны савецкія фільмы «Бриллиантовая рука» і «Чырвоное лісце» ў Саках, Семяноўцы, Скупаве, Старым Корніне і Дубічах Царкоўных (Гайнаўскі павет). У Тарнопалі пасля фільма адбылася сустрэча сакратара гайнаўскага аддзела БГКТ Віктара Буры з актывам гуртка, на якой, між іншым, была абмеркавана дзейнасць гуртка, які шэфствуе над мясцовым клубам. Штатны працаўнік клуба Галена Бельская (яна актыўны член БГКТ) прадставіла праблематыку працы гуртка ў насценных газетках. Да найбольш ініцыятыўных людзей гуртка БГКТ залічаецца тут Уладзімір Гайдук — мясцовы літаратар, зборнік вершаў якога выдала Галоўнае праўленне БГКТ. (мх)

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З ДУБЯЖЫНА

ПРАЦЯГ ДУБЯЖЫНСКІХ ПРЫГОД

Калі мы выбіраліся ў Беласток на цэнтральны агляд «Беларуская песня — 73», у нашай вёсцы па-рознаму пра нас думалі. Адны смяяліся, другія падбадзёрвалі: «Хлопцы, заспявайце так, каб і мы былі задаволены, каб нас не ўсё ваяводства пахвалілі».

Паехалі. Была нядзеля і сыпаў пушысты снег. У акне вагона краявід

(Працяг на стар. 3)



Вакальны калектыў з Дубяжына, які на цэнтральным аглядзе «Беларуская песня — 73» заняў II месца. Фота А. Карпюка.

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „Ніве"

Справаздача аб цэнтральным аглядзе драмгурткоў ● Справаздача аб II пленуме ГП БГКТ ● Візіт у беластоцкім аддзеле Інстытута метэаралогіі ● Аб беларускай літаратуры ў Чэхаславакіі ● Магіла ў Лядскай пушчы ● Заходняя МВС — карэспандэнцыя з Мінска ● Весткі з Ячна, Багданкаў, Дубяжына, Навакорніна, Грыгараўцаў, Кляшчэляў, Гарадка, Ялоўкі і Юшкавага Груда ● Песня «Чэрвона рута».

КАЛОДНА — вёсачка дружная


Долам уецца рака Плоска, а навакольныя горы — Лысую, Каралёву, Анны, Яна, Святую — схаваў стромкі густы лес. У гэтым маляўнічым куточку сённяшняга Беластоцкага павету здаўна гаспадарыць чалавек, а сівая мінуўшчына, якой не запісалі афіцыяльныя хронікі, усё яшчэ жыве ў легендах ды мясцовых назвах. Легенды і назвы... Яны тут пераплаліся і стварылі адзінае цэлае: Крулёвы Мост, Пераходы, Калодна. Людскі пот, кроў і мары аб лепшай будучыні запоўнілі іх.

Недзе ў XVI стагоддзі, калі кароль Зыгмунт Аўгуст са сваёй прыдворнай світай ехаў у Гродна, надвячоркам пазалочаныя карэты затрымаліся каля балоцістай ракі. Не хацелася каралю ды вяльможам совацца ўброд — чаго добрага ў балотнай твані запэцкаешся ці карэту пашкодзіш. Князь Радзівіл на момант адхіліўся ад світы — і ўміг паскакалі на конях пасыльныя ў навакольныя сёлы. Тутэйшыя маёнткі належалі яго слаўтаму роду, і не мог жа на радзівілаўскай зямлі кароль абмачыць у багну свой туфель з брыльянтавымі пражкамі!.. Перад захадам сонца цівуны сагналі сотні прыгонных сялян. Загудзеў лес. А калі першыя прамені раніцы глянулі з-за вяршалінаў дрэў, абодва берагі ракі Плоскі злучаў навюсенькі, моцны і прасторны мост. Зыгмунт уз'ехаў на яго, выйшаў з карэты, глянуў. Са смалістых бярвенняў капала пахучая празрыстая жывіца. Смярдзючы пот прыгонных не меў права трапіць у шляхетныя каралеўскія ноздры — вакол не было і душы. Мост назвалі Крулёвым. Але на ім доўгія гады нешта страшыла, і простыя людзі здалёк яго абміналі. Цераз Плоску хадзілі і ездзілі ўброд каля Пераходаў.

Корпус напалеонаўскага маршала Нея ў не-

(Працяг на стар. 3)

◊Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Весткі

 **СВЕТ**  **БССР**  **ПОЛЬШЧА**  **ВАЯВОДСТВА**

УЗНАГАРОДА НГУЕН ТХІ БІНЬ

28 сакавіка Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. Падгорны ўручыў у Крамлі ордэн Дружбы народаў вядомай грамадскай дзеячцы, члену Цэнтральнага Камітэта Нацыянальнага фронту вызвалення, міністру замежных спраў Рэспублікі Паўднёвы В'етнам Нгуен Тхі Бінь. Гэтай узнагароды яна ўдастоена за вялікія заслугі ў справе ўмацавання міжнароднай салідарнасці прагрэсіўных, дэмакратычных і міралюбівых сіл, за плённую дзейнасць па забеспячэнню міру ў В'етнаме і згуртаванню патрыятычных сіл Паўднёвага В'етнама і ў сувязі з Міжнародным жаночым днём 8 сакавіка.

АБ ЛЁСЕ «МАЛЫХ ТЭРЫТОРЫЙ»

У спецыяльным камітэце ААН па ажыццяўленню Дэкларацыі аб прадстаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам абмяркоўваецца пытанне аб лёсе так званых «малых тэрыторый», якія ўсё яшчэ застаюцца пад каланіяльным панаваннем імперыялістычных дзяржаў.

Пытанне аб «малых тэрыторыях» набывае вялікае значэнне ў сувязі са спробамі каланіяльных дзяржаў захаваць сваё панаванне над імі пад выглядам няздольнасці малых краін да самастойнага кіравання. У захаванні за сабой «малых тэрыторый» каланіяльныя дзяржавы бачаць перш за ўсё магчымасць іх выкарыстання для стварэння ваенных баз у важных стратэгічных раёнах, што вядзе да падтрымання міжнароднай напружанасці.

ВАЖНАЯ ПАДЗЕЯ

У палітычных і грамадскіх колах ФРГ надалі вялікае значэнне прыёму Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. Брэжневым пасла ФРГ у Савецкім Саюзе У. Зама. На прэс-канферэнцыі прадстаўнік урада ФРГ ахарактарызаваў гэты прыём як важную падзею. Падкрэсліваючы, што У. Зам перадаў Л. Брэжневу асабістае пасланне кіраўніка ўрада ФРГ В. Бранта, газета «Генерал-анцайгер» піша: «Савецка-заходнегерманскія кантакты і гутаркі праходзяць пад знакам нармалізацыі адносін паміж дзвюма краінамі і ўздзеяння дагавору паміж СССР і ФРГ».

У колах палітычных назіральнікаў у Боне напамінаюць аб урадавай заяве, з якой выступіў у студзені гэтага года канцлер В. Брант, які падкрэсліў, што ўрад ФРГ «будзе імкнуцца да шырокага супрацоўніцтва з дзяржавамі Усходняй Еўропы». «Для Бона, — піша ў гэтай сувязі газета «Вестфеліше рундшау», — гутарка ідзе аб тым, каб актыўна працягваць палітыку, якая пачата ўсходнімі дагаворамі (г.зн. дагаворамі ФРГ з СССР і Польшчай), каб не стваралася ўражанне, быццам гэта фраза практычна закончылася з заключэннем гэтых дагавораў».

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ЎРАДА

Прэзідэнт Чылі Сальвадор Альендэ правёў рэарганізацыю ўрада. Назначана 6 новых міністраў. Міністрам унутраных спраў стаў сацыяліст Херадда Эспіноса Карыльо. Ён замяніў на гэтай пасадзе генерала Карпаса Пратаса, які пайшоў у адстаўку. (ак)

ДОМ I З'ЕЗДУ РСДРП

На зарэчнай ускраіне Мінска, на былой Захар'еўскай вуліцы, у маленькім драўляным доміку чыгуначніка сацыял-дэмакрата П. В. Румянцава ў сакавіку 1898 года сабраўся I з'езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, які абвясціў аб стварэнні марксісцкай партыі рабочых царскай Расіі. Удзельнікі З'езду абралі Цэнтральны Камітэт і выпрацавалі прынцыпы партыйнага будаўніцтва. Была гэта знамянальная падзея для ўсяго сусветнага рабочага руху.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі дом П. В. Румянцава быў пераўтвораны ў «Дом-музей I з'езду РСДРП». У час акупацыі гітлераўцы зраўнялі яго з зямлёй, але неўзабаве гістарычны дом быў нанава адбудаваны з захаваннем даўнейшага выгляду і ўнутранага распланавання.

Цяпер Дом-музей I з'езду РСДРП наведваюць тысячы грамадзян Савецкага Саюза і замежныя госці, бо гэтае месца ў сталіцы БССР дарагое кожнаму камуністу, працоўным усёй зямлі.

За 75 год ад дня I з'езду РСДРП пад кіраўніцтвам партыі савецкі народ здзейсніў няведаныя пераўтварэнні ў сваім жыцці.

100 ДАДАТКОВЫХ ТРАКТАРАЎ

Калектыў Мінскага трактарнага завода 28 сакавіка выпусціў за вароты прадпрыемства ўжо соты ў гэтым годзе звышпланавы трактар. Пры гэтай нагодзе варта прыпомніць, што 5 лістапада з канвеера Мінскага трактарнага завода сышоў мільённы трактар «Беларусь».

КАЛІСЬЦІ ЗВАЛІ ЛЯХАЎКАЙ...

Ляхаўка — у мінулым адна з ускраін Мінска.

Пасля Вялікага Кастрычніка перайменавана ў Чырвоны Гай, які стаў месцам адпачынку мінчан. У пасляваенныя гады менавіта тут былі ўзведзены прамысловыя гіганты, а між іншым трактарны, аўтамабільны, маторны і падшыпнікавы заводы. Вакол іх выраслі жылыя пасёлкі. Вялікі сасновы масіў ператвораны ў лесапарк. Па выпуску прамысловай прадукцыі былая Ляхаўка займае сёння першае месца сярод кварталаў сталіцы БССР.

КВАТЭРЫ ДЛЯ МАЛАДАЖОНАЎ

У вёсцы Стараселле Шклоўскага раёна вырас новы жылы мікрараён, які складаецца з трыццацідвухкватэрных дамоў. Яны па-сучаснаму абсталяваны. Праўленне калгаса імя Кірава рашыла гэтыя кватэры прызначыць для маладых сем'яў.

24 ЦЭНТНЕРЫ

З Брэста паведамляюць, што калгасы і саўгасы вобласці вырашылі сёлета атрымаць з кожнага гектара па 24 цэнтнеры збожжа. (вр)

VI КАНГРЭС ЗСЛ

У Варшаве ў зале філармоніі тры дні працаваў VI кангрэс ЗСЛ. Прыехала на яго многа заграніччных дэлегацый сялянскіх партый з усяго свету.

ЗСЛ налічвае цяпер 430 тысяч членаў і выконвае важную палітычную і гаспадарчую ролю ў жыцці краіны. Сваю працу Кангрэс канцэнтраваў на інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

ЧАРГОВАЯ ВАЯВОДСКАЯ...

справаздачна-выбарная канферэнцыя адбылася ў Жэшове. Жэшоўская ваяводская арганізацыя налічвае 113 тысяч членаў. Удзельнічаў у канферэнцыі член Палітбюро, міністр замежных спраў ПНР Стэфан Альшоўскі.

На Жэшоўшчыне працуюць такія вядомыя прадпрыемствы, як ВСК у Мельцы, дзе рабочыя прынялі ў апошні час абавязацельствы пабудаваць навейшага тыпу самалёт для сельскай гаспадаркі, як «Зэльмер» у Жэшове, які прадукуе навейшыя тыпы тавараў дамашняга характару. На камбінаце «Сталёва Воля» на працягу апошняга месяца апрацаваны новы спосаб выплаўкі новага гатунку сталі, які неабходны для прадукцыі цяжкіх трактараў.

МАТУРЫ Ў 1973 ГОДЗЕ

Уся моладзь сярэдніх школ розных тыпаў у гэтым годзе прыступіць да экзаменаў на атэстат сталасці ў адзін дзень. Пісьмовыя экзамены адбудуцца ў цэлай краіне 10 мая — па польскай мове, 11 — па матэматыцы, 12 — экзамен па замежнай мове, 14 — экзамен па выбраным прадмеце з пяці наступных: фізіка, хімія, біялогія, геаграфія, навука аб Польшчы і сучасным свеце.

КРАСАВІК — МЕСЯЦ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАМЯЦІ

ЗБоВіД і Рада аховы помнікаў змагання і мук накіравала заклік да грамадства, у якім напамінае трагедыю апошняй вайны, змаганне Савецкай Арміі і Польскага Войска. Гаворыцца ў заклiку аб памяці пра тых, якія загінулі за нашу свабоду.

15 сакавіка гэта Дзень ветэрана, які ва ўсёй Еўропе адзначаецца пад лозунгам барацьбы за мір, бяспеку, агульнае раззбраенне і мірнае суіснаванне.

У «ТРЫБУНЕ ЛЮДУ» ПРА БЕЛАСТОЧЧЫНУ

У сувязі з ваяводскімі партыйнымі канферэнцыямі «Трыбуна Люду» — орган ЦК ПАРП увяла на свае старонкі публікацыі пра розныя ваяводствы. У апошні тыдзень у пятніцу выйшла старонка, прысвечаная Беласточчыне. Вядучым артыкулам быў: «Прафесіянальная амбіцыя гаспадароў: больш прадукаваць для краіны».

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ САЮЗ ПОЛЬСКІХ СТУДЭНТАЎ

Такую назву прыняў з'езд польскіх студэнтаў, які адбыўся ў мінулым тыдні. Прысутнічаў на ім член Палітбюро, сакратар ЦК Ф. Шляхціц. Праграма студэнцкай арганізацыі, якая, як усе іншыя маладзёжныя арганізацыі, увайшла ў Федэрацыю сацыялістычнага саюза польскай моладзі, у скарачэнні гучыць: наша энергія, энтузіязм і веды будуць служыць краіне. (вл)

Е. ЛУКАШЭВІЧ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Гэтымі днямі на Беласточчыне прабываў сакратар ЦК ПАРП тав. Е. Лукашэвіч. У суправаджэнні I сакратара ВК ПАРП З. Куроўскага, сакратара ВК Я. Златажынскага, галоўнага рэдактара «Газеты Беластоцкай» М. Юрковіча і іншых, Е. Лукашэвіч сустрэўся з палітычным і грамадска-гаспадарчым актывам у Сувалках, а затым наведаў будову перадатачнай тэлевізійнай станцыі.

XXIII СЕСІЯ ВРН

3 сакавіка адбылася XXIII сесія Ваяводскай рады народовай. Абмяркоўвалася дзейнасць ПРН у Ломжы. З дакладам аб дасягненнях Ломжынскага павету выступаў старшыня ПРН у Ломжы Е. Нэвэльскі. Падкрэслівалася, што ломжынскія сяляне значна павялічылі ў апошнія гады свінагадоўлю. Таварная прадукцыя ўзрасла на 68,8% у параўнанні з 1969 годам. Праца ПРН у Ломжы была добра ацэнена на сесіі. У прынятай па гэтаму пытанню пастанове звяртаецца ўвага на неабходнасць хутчэйшага будаўніцтва новых аб'ектаў для прамысловасці і жылых дамоў, палепшыць якасць і павялічыць колькасць прамысловых вырабаў, развіваць садоўніцтва і агароднiцтва, палепшыць дарогі, палепшыць умовы працы ў пляцоўках службы здароўя і інш.

На сесіі абмяркоўвалася таксама дзейнасць радных, прынята была пастанова аб павелічэнні выдаткаў на патрэбы аховы здароўя. Зацверджаны быў таксама спісак курортных мясцовасцей, у якіх будзе ўведзена дадатковая аплата. Сярод іх — Белавежа.

НАРАДА КАМЕНДАНТАЎ

У КВ МО ў Беластоку адбылася нарада камендантаў гмінных пастарункаў міліцыі. На нарадзе прысутнічалі віцэ-міністр унутраных спраў ген. брыг. М. Мілеўскі і намеснік старшыні Прэзідыума ВРН Р. Лазаровіч.

На нарадзе абмяркоўваліся задачы гмінных пастарункаў па палепшэнню бяспекі і грамадскага парадку. Падкрэслівалася неабходнасць звярнуць больш увагі на выхаваўча-прафілактычную дзейнасць і завастрыць кару для тых, хто свядома парушае законы грамадскага сужыцця.

ДЗЕНЬ ТЭАТРА

Урачыста быў адзначаны ў нашым ваяводстве міжнародны дзень тэатра. 27 сакавіка перад пачаткам спектакля дырэктар тэатра Б. Орліч прывітаў прыбыўшых на спектакль прадстаўнікоў партыйных і дзяржаўных улад на чале з сакратаром ВК ПАРП Я. Златажынскім. Ён падзякаваў за віншаванні, атрыманыя ад экзекутывы ВК ПАРП, аддзела культуры ПВРН, шматлікіх устаноў і гледачоў. Дэлегаты ўсіх гэтых устаноў і беластоцкіх школ уручылі артыстам шмат кветак.

(яч)



Niedziela 8.IV.

7.35 Program dnia. 7.40 TV Kurs Rolniczy. 8.15 „Przypominamy, radzimy”. 8.25 „Nowoczesność w domu i zagrodzie”. 9.00 TELERANEK. 10.20 „Antena”. 10.35 „Wszystko dla ich dobra” — film dok. ang. („Świat, który nie może zaginąć”) odc. II. 11.00 „W starym kinie” — „Dzwonnik z Notre Dame” — film arch. 12.15 Dziennik. 12.30 „Na chłopski rozum”. 13.00 Dla dzieci: Z. Poprawski — „Smok bestyja”. 13.45 „Piórkiem i węglem”. 14.10 Sportowy magazyn sprawozdawczy; w I przerwie ok. 14.30 Losowanie Toto-lotka; w II przerwie ok. 15.30 Wiadomości dziennika. 16.30 „Śladami Piastów Śląskich” — ŚWIDNICA. 17.00 Gra Orkiestra TV Katowice. 17.25 „Pojedynek 2” — I runda (Tadeusz Ross i Jacek Żemantowski). 18.15 „Tele-Echo”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Contessa” — film pol.-franc. („Wielka miłość Balzaka”) odc. III. 21.00 PKF. 21.10 „Ta najwierniejsza” — Jubileusz „Przyjaciółki” — program z okazji 25-lecia tyg. „Przyjaciółka”. 22.20 Magazyn sportowy.

Poniedziałek 9.IV.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 15.20 i 22.45 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec”. 17.30 „Echo stadionu”. 17.55 TV Kurier Olsztyński. 18.10 „Oferty”. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: K. Capek — „Biała zaraza”. 21.15 „Pryzmat”. 21.45 Dziennik i Wiadomości sportowe. 22.10 Utwory fortepianowe Ravela i Debussy'ego gra Bernard Ringeisen (Francja).

Wtorek 10.IV.

9.00 „Contessa” — film pol.-franc. („Wielka miłość Balzaka”) odc. III. 10.00 Dla szkół: (kl. IV) „Tu mieszkał Mikołaj Kopernik”. 10.55 Dla szkół (kl. III lic.) Język polski — St. Witkiewicz — „W małym dworku”. 13.50 Program dnia. 13.55 Sprawozdanie z meczu hokejowego o Mistrzostwo Świata — grupa A — Czechosłowacja — Szwecja. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.10 Program rozrywkowy. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Morskie spotkania”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Zaloty pięknego dragona” — film fab. czechosł. 21.35 „Spotkanie z pisarzem — Mieczysławem Jastrunem”. 22.05 Dziennik i Wiadomości sportowe. 22.35 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 23.10 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin.

Środa 11.IV.

8.25 „Zaloty pięknego dragona” — film fab. czechosł. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Fizyka — „Sprężone powietrze”. 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Fizyka — „Silnik spalinowy”. 11.55 Dla szkół: (kl. VII) Historia — „Polskie słowo”. 12.45 Technikum Rolnicze: Zoologia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 14.00 „Wybieramy zawód”. 15.20 i 23.15 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Słowo honoru”. 17.10 Dla dzieci: L. Górski — „Misie nie chcą iść spać” — widowisko Państw. Teatru Lalek „Tęcza” w Słupsku. 17.35 „Informacje, Towary, Propozycje”. 17.55 „Przez Afrykę” — film dok. czechosł. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Magazyn medyczny. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Zbieg okoliczności” („Opowieści mojej żony”). 20.15 „Maria” — film radz. („Cienie zanikają w południe”) odc. I. 21.35 Sprawozdanie z meczu hokejowego o Mistrzostwo Świata — grupa A Polska — Zw. Radziecki. 22.50 Dziennik.

Czwartek 12.IV

7.40 „Maria” — film radz. („Cienie zanikają w południe”) odc. I. 9.00 Dla szkół: (kl. VII) Chemia — „Zasady”. 9.55 Dla szkół: (kl. II lic.) Język polski — „Bolesław Prus”. 10.55 Dla szkół: (kl. III lic.) Język polski — St. Witkiewicz — „W małym dworku”. 11.55 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Język polski — „Film”. 14.00 Matematyka w szkole: „Mnożenie i dzielenie liczb”. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem”. 17.45 PKF. 17.55 „Mistrzowie batuty” — Stanisław Wisłocki. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 Program publicystyczny. 19.10 „Przypominamy, radzimy”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.00 „Alfred Hitchcock przedstawia” — film. 20.50 „Refleksje”. 21.20 Sprawozdanie z meczu hokejowego o Mistrzostwo Świata — grupa A Finlandia — Polska. Wiadomości sportowe. 22.50 Dziennik. 23.15 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 23.50 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt.

Piątek 13.IV.

9.00 „Alfred Hitchcock przedstawia” — film. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Geografia — „Pojezierze Mazurskie”. 10.55 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie techniczne — „Elektronika na codzień”. 11.55 Dla szkół: (kl. VIII) Chemia — „Szkło”. 12.45 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Botanika. 15.20 i 23.35 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Rysunek techniczny. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora”. 17.30 Sprawozdanie z meczu hokejowego o Mistrzostwo Świata — grupa A Zw. Radziecki — Czechosłowacja; w I przerwie: „Nie tylko dla pań”; w II przerwie: TV Kurier Warszawski. 19.50 Dobranoc. 20.00 Dziennik. 20.30 „Wieczór bez gwiazdy” — Elżbieta Jodłowska. 21.05 „Panorama”. 21.45 Teatr TV na świecie: M. Gorki — „Jegor Bułyczow”, widowisko TV radzieckiej. 23.05 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Sobota 14.IV.

8.30 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Mata Hari”. 9.55 Dla szkół: (kl. VII) Zoologia — „Ptaki”. 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Geografia — „Japonia”. 11.55 Dla szkół: (kl. IV lic.) Biologia — „Ochrona biosfery”. 13.45 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 14.20 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 14.50 Program dnia. 14.55 Program I proponuje. 15.15 Redakcja Szkolna zapowiada. 15.30 TV Informator Wydawniczy. 15.55 Teatr Młodego Widza: Molier — „Szelmostwa Skapena”. 17.15 Dziennik. 17.30 Sprawozdanie z meczu hokejowego o Mistrzostwo Świata — grupa A NRF — Polska; w I przerwie: „Turystyka i wypoczynek”; w II przerwie: Wiadomości sportowe. 19.50 Dobranoc. 20.00 Monitor. 20.45 „Gwiazdy siedmiu stolic” — Głos ma Berlin. 21.45 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.10 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Mata Hari”.



Piątek, 6 kwietnia

8.05 Film fab. 10.05 Szkoła szachowa. 10.35 Filmy dokument. 13.20 Program dnia. 13.25 Spektaki kukiełkowy dla dzieci. 17.25 Film fab. 19.00 Czas. 20.35 Film dokument.

Sobota, 7 kwietnia

7.00 Program dnia. 7.30 Białe i czarne. 7.50 Mozaika muzyczna. 8.05 Przegląd międzynarodowy. 8.20 Film dokument. 9.15 Koncert zespołów amatorskich. 10.10 Film fab. 13.10 Spotkanie z kosmonautą. 13.55 Hokej. Finlandia — Czechosłowacja. 16.15 Śpiewa Zykina. 17.00 Czas. 17.25 Hokej. Szwecja — ZSRR. 19.45 TV teatr miniatur. 20.35 Ekran i czas.

Niedziela, 8 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 12.45 Koncert życzeń. 13.15 Klub filmowy. 14.25 Film fab. 16.40 Koncert. 17.00 Czas. 17.25 Hokej. NRF — ZSRR. 19.45 Panorama filmowa. 21.15 Piłka nożna. SKA (Rostów) — „Dynamo” (Mińsk).

Пачатак на стар. 1

Калодна — вёсачка дружная

калькі дзесяткаў тысяч салдат і афіцэраў, сабраных з усяе Еўропы, пагодным летнім ранкам 1812 года стаяў тут з адкрытымі галовамі. Духавенства служыла абедню ля пераноснага алтара за перамогу над Расіяй. Шапацела лісце, дзвэнкала зброя, храплі коні. Над людскім морам лунала абяцанка вялікай перамогі і багатых трафеяў на далёкай рускай зямлі.

Калючы марозны вецер бязлітасна рэзаў прадрогшыя целы, і ноч захапіла напалеонаўскіх недабіткаў на рацэ Плосцы. Вось толькі пяройдуць па ільду на той бераг і ў лесе распаляць вогнішчы, перадыхнуць трохі.

— Летам мы тут слухалі абедню, — успомніў уголас афіцэр з адмарожаным тварам і азірнуўся.

З гушчару з гіканнем выскачыла сотня казакоў. Бой быў кароткі. На трэці дзень напалеонаўскіх ваякаў сяляне закапалі ў мёрзлую зямлю там, пад крыжам, дзе ўлетку ім служылі абедню.

А праз пяцьдзесят год паўстанчаскі атрад вёў тут крывавы бой з царскімі войскамі. Многа палягло дзецюкоў-паўстанцаў. Хавала іх Калодна на Святой гары і плакала.

Пры санацыі ў Калодне кожны пяты мужчына належаў да Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, а амаль што ўсе да «Грамады». Вёска чытала «Чырвоны сцяг», «Бальшавік», лістоўкі. Ваявала супроць санацыйных секвестратараў, сама баставала і збірала грошы да харчы бастуючым лясным рабочым. У часе вайны карміла, апранала і перахоўвала партызанаў.

Вёска Калодна ведала, за што змагаецца.

Сёння ў Калодне кожны гаспадар штогод кантрактуе і здае па 5—8 кормнікаў, трымае па 3—5 штук дойных кароў і за малако бярэ па 2—4 тысячы злотых у месяц. І так грош да граша — збіраецца адпаведная сума. А людзі там гаспадарныя і ашчадныя, таму кожны год прыбывае ў вёсцы новых прасторных мураваных дамоў з цэнтральным ацяпленнем і гідрафорнямі, вялікіх сучасных хлявоў, а таксама абшырных, на два токі, стадолаў.

Ды не толькі будынкі змяняюць аблічча сучаснага Калодна. У штодзённы быт увайшлі пральні, пыласосы, радыё, тэлевізары. Гаспадары і гаспадыні ўсё часцей едуць у Гарадок ці ў Беласток за пакупкай новых сельскагаспадарчых машын: касілак, сеялак, грабільняў, машын да пераварочвання сена, добрых вазоў і іншых прыладаў. У Калодне любяць новую тэхніку і гаспадараць па-новаму.

Калодна — вёска дружная. Тут не любяць рабіць на злосць суседу, сварыцца ды цягацца па судах. Людзей тут займае зусім штосьці іншае — падумаць ды супольна зрабіць штокольвечы для агульнага дабра.

І так, у грамадскім чыне паклалі на вясковай вуліцы тратуары, дапамаглі ў меліярацыі, цяпер дапамагаюць пабудаваць салідную шашу да Крулёвага Мосту. У 1964 годзе задумалі грамадскім чынам пабудаваць святліцу. Пачалі збіраць сродкі, абмяркоўваць план будынку. Па меры таго, як павялічвалася ахвота да будовы, разрасталіся і патрэбы. І вось замест сякой-такой святлічкі ў канцы 1972 года паўстаў прасторны мураваны будынак з тэатральнай залай на якіх 100 гледачоў, спецыяльным пакоем на сходы розных арганізацый і рэпетыцый, кабінай на кінаапаратуру, спецыяльным пакойчыкам для вясковых арганізацый.

Агульны кошт будынка склаў каля 370 тысяч злотых, у тым ліку каля 200 тысяч грашмі, матэрыяламі і працай дала вёска, а рэшту дакладаў прэзыдыум ПРН у Беластоку.

Пакуль мела наступіць афіцыяльнае адкрыццё вясковага дома культуры, Калодна сыграла ў ім тры вяселлі. Цяпер жа ў калодненскім доме культуры будзе працаваць сталы лектарат Таварыства паўсюдных ведаў, гурткі зацікаўлення пластыкай для дзяцей, будзе наведвацца аб'язное кіно.

Гэта для пачатку.

Калодна — вёска амбітная. І не прыдзецца нам доўга чакаць, як паўстане там і мастацкі гурток. Спяваць тут любяць і ўмеюць. Жыхарка Калодна Аляксандра Грыцук праспявала мне некалькі прыгожых беларускіх народных песень. А калі б да яе далучыліся іншыя жанчыны і маладзіцы — паўстаў бы цудоўны народны хор! Пад сілу старэйшым і малодшым каладнянам таксама паставіць цікавую сцэнку. Ёсць жа і ахвотныя на чале са старшынёй мясцовага гуртка Саюза сацыялістычнай сялянскай моладзі Мікалаем Казлоўскім і светліцовай Галінай Казлоўскай.

— Што ж, гэта бадай у вас ужо будзе ўсё, — заўважаю ў часе маёй размовы ў Калодне.

— О, не! — усклікае Ян Дарашкевіч — старшыня мясцовай проціпажарнай стражы. — Тут, каля дома культуры закладзен здаўна падмурак пад новую рамізу. Яна павінна быць пабудавана!..

— Людзі падумваюць аб добрым водаправодзе, — кажа солтыс Казімір Тарасевіч. — Вады ў дамы ды ў хлявы штораз болей трэба. Цяжкавата ўвесь час са студні цягаць. А ўлетку і да сухога дна ў калодзежах дастаемся...

Так. Ля падножжа паўстанцкай гары, у невялічкай вёсачцы Калодна здзяйсняюцца колішнія мары.

Мікалай Гайдук

НАШ КОД

15-950

Многія чытачы, адрасуючы да нас пісьмы, пішуць кодавы нумар 15-093, які фігуруе ў кодавай кніжцы пры вуліцы Весялоўскага 1. Вядома, пісьмы даходзяць. Але ў нас на пошце ёсць таксама закадаваная паштовая скрынка, якой у кодавай кніжцы няма, а якая можа прыспешыць дарогу да рэдакцыі. Таму, пішучы да нас пісьмы, адрасуйце: Redakcja tygodnika „Niwa", skr. poczt. 281, 15-950 Białystok.



Экскурсанты знаёмяцца з ходам прадукцыі ў ткальні.

З ВІЗІТАМ У ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

90 перадавых сялян з Шымкаўскай гміны Беластоцкага павету наведала Беластоцкае прадпрыемства баваўнянай прамысловасці «Фасты» ў Беластоку. Запрасіла іх да сябе ў госці дырэкцыя гэтага прадпрыемства. Сяляне з вялікім зацікаўленнем знаёміліся з ходам працы на гэтым адным з найбольшых беластоцкіх прадпрыемстваў.

Тэкст і фота — А. Савіцкага

(Працяг са стар. 1)

Працяг дубяжынскіх прыгод

мяняўся. Калі прыехалі мы ў Беласток, снегу ўжо было шмат і сябры жартавалі, што ў гонар беларускай песні будзе, урэшце, зіма.

Хутка пераапрануліся ў народныя кашулі і выйшлі на сцэну. Мяркуючы па ўсім, наша выступленне спадабалася гледачам. Ледзь мы зышлі са сцэны, як нас абступілі самадзейнікі з іншых вёсак і запрашалі прыехаць да іх з выступленнем. Мы паехалі б ахвотна, але не маем такой праграмы, каб хапіла на даўжэйшы час.

Закончыўся конкурс, і мы паехалі дамоў у свой родны Дубяжын. Як выйшлі з цягніка, снегу было ўжо па калена. Заспявалі «Сняжыначку», якую пераймалі ад бельскага хору. Дамоў вярнуліся ноччу.

Прайшоў панядзелак, а ў аўторак прыйшла ў вёску «Беластоцкая газета». Аднавяскоўцы не ведаюць, што думаць пра нашых хлопцаў. Газета бегае ад суседа да суседа. Людзі паказваюць у ёй наш здымак і гавораць: «Вось, пабачце, як нашы хлопцы заслужыліся, другое месца ўзялі ў Беластоку. Няхай спяваюць, няхай нашы песні слухае цэлы свет, няхай ведае, што наш куток не глухі і не цёмны».

— Калі прымеце нас, старэйшых, — паплылі заяўкі, — дык і мы прыдзем і заспяваем.

— Прыходзьце, — кажу, — будзе і нам, маладзейшым, прыемна з вамі спяваць.

— Але дзе мы ўсе змесцімся? — кажуць. — Мала месца ў гэтага Амельянюка.

Я зноў ім кажу: — Паеду ў Бельск, у гміну, даведаюся, калі яны будуць канчаць святліцу. Там было б нам усім месца даволі.

Паехалі мы з Пятром Аверчукам у гміну. Знайшлі прадстаўніка ад гэтых спраў і гаворым яму:

— Пане Дэм'янюк, як будзе з нашай святліцай?

А ён кажа: — Пакуль што не маю часу гаварыць з вамі, бо іду афармляць справы.

Я сабе падумаў і кажу яму:


— А нашы справы, то не справы?

Тады ён гаворыць: — Да 30 мая святліца будзе закончана.

Але да якога году, не сказаў. Сабраўся і пайшоў ад нас. Пайшлі і мы з гэтым дамоў. Не ведаю, як вам ужо аб гэтым і пісаць. Ці ўрэшце знойдуцца людзі, якія ацэняць належна грамадскую справу?

Мікалай Раманюк, Дубяжына

Этнаграфічнае акенца



Вятрак каля вёскі Фальваркі Вялікія Беластоцкага павету. Фота М. Гайдука.

500 гадоў Мікалая Каперніка

У сувязі са святкаваннем 500-ай гадавіны з дня нараджэння вялікага польскага астранома Мікалая Каперніка клуб настаўнікаў і Павятовая педагагічная бібліятэка ў Гайнаўцы арганізавалі семінар пад лозунгам «Навуковыя дасягненні Мікалая Каперніка і навуковы ўклад доктара Тадэуша Ракавецкага ў навуку астраноміі». Не без прычыны навуковы плён М. Каперніка быў спалучан з успамінам аб жыцці і навуковых дасягненнях вялікага чалавека — доктара медыцыны, астранома і грамадскага дзеяча Т. Ракавецкага. Вялікай прыгодай і найбольшым захапленнем была ў яго жыцці астраномія. У міжваенны перыяд ён напісаў і выдаў друкам некалькі навуковых кніг і іншых работ па астраноміі. Быў членам польскага і шматлікіх замежных астранамічных таварыстваў.

У Доме настаўніка была адкрыта выстаўка навуковых работ М. Каперніка, а таксама памятак, у тым ліку і кніг др Т. Ракавецкага. Выстаўку папоўнілі рысункі гайнаўскіх школьнікаў і настаўнікаў-жывапісцаў Анатоля Корзуна і Віктара Кабаца. Выстаўку адкрыла ўдава па памершым лекары — Пелагея Ракавецкая.

Падчас семінара сваімі ўспамінамі аб доктары Т. Ракавецкім падзяліўся з удзельнікамі семінара пажылы настаўнік з Гайнаўкі — Юльюш Айжаноўскі. Ён прынёс з сабой магнетафон, пры дапамозе якога запісаў на магнетафонную плёнку голас др Т. Ракавецкага. Запісы ўсе слухалі з вялікім зацікаўленнем. Пазней выступілі школьны тэатральны калектыў «Факт», які дзейнічае пры агульнаадукацыйным ліцэі № 9 у Гайнаўцы. Выступіў ён са слоўна-музычным мантажам аб М. Каперніку.

На заканчэнне семінара дэманстраваўся кінафільм пад загалоўкам «Мікалай Капернік» і выступіў з гутаркай аб слаўным польскім астраноме М. Каперніку доктар астраноміі А. Маркс. (ця)

Пачатак на стар. 1



— Дажынкі нашы будуць характарызавацца рэгіянальным каларытам Беласточчыны. Найважнейшыя рэгіянальныя мерапрыемствы на дажынках гэта: краёвая ярмарка народнай тканіны, арганізаваная як фестываль народных мастакоў, выстаўка народнай творчасці розных іншых форм, кірмашы народнага рукадзелля, выстаўкі прац нашых мастакоў, паказы дажынковых вянкоў Беласточчыны. Плануем таксама арганізаваць вялікую народную ярмарку, якая будзе адбывацца бесперарыўна ў час дажынак.

Да дажынак прыцягнем вёску. Хачу сказаць, што кожная вёска мае тут магчымасці паказаць усё, што мае найлепшае. І не толькі выступіць з праграмай калектыву, але раней за ўсё правесці пераддажынкавыя парадкі на месцы ў сваёй вёсцы, ачысціць і ўпрыгожыць вёскі, святліцы і клубы, прыбраць іх адпаведна.

1 мая зробім гмінныя агляды мастацкіх калектываў. Хочам такім чынам разбудзіць культурную актыўнасць і адзначыць свята працы, а таксама вылавіць найлепшыя калектывы. Трэба, каб у гэты час у кожнай вёсцы было нешта зроблена, каб у час падрыхтоўкі да дажынак мы змаглі пашырыць наш рэгіянальны грамадскі рух.

22 ліпеня адбудуцца павятовыя агляды тых калектываў, якія аказаліся найлепшымі ў гмінных аглядах. А найлепшыя з павятовых аглядаў стануць на цэнтральных дажынках.

— Значыць, кожны калектыў, у якой бы форме ён не працаваў, мае шанцы прадставіцца ў Беластоку на дажынках?

— Так! У Беластоку ў час дажынак будзе многа эстрад і месц, дзе ўсе найлепшыя калектывы змогуць паказаць свае дасягненні.

— Вы глядзелі цэнтральны агляд «Беларуская песня — 73». Як вам гэта спадабалася? Як увогуле ацэньваеце ролю Беларускага таварыства ва ўсім, аб чым мы гаварылі?

— Агляд мне вельмі спадабаўся. Быў багаты, многа народнасці, вялікі ўдзел маладых і старэйшых, многа розных вакальных форм.

Таварыства мае вялікую ролю ў актывізацыі паўднёва-ўсходніх раёнаў нашага ваяводства, дзе перш за ўсё дзейнічае. Гэта цікавы і актыўны раён. Беларускае таварыства робіць кусок добрай работы. Гэта не абазначае аднак, што нельга і не трэба рабіць лепш і больш. Нашы вымаганні і нашы патрэбы растуць, таму і дзейнасць і працу сваю трэба паднімаць вышэй і пашыраць. Вымагаць больш ад сябе і іншых.

Размову вяла Вера Лейчук
Фота: А. Карпюка

Людзі добрай работы ◆ Мікалай Сідарук ◆

Гаспадарыць ён на сямі гектарах зямлі ў вёсцы Чарэўкі-Кажаны. У мінулым годзе ўраджай чатырох асноўных збожжавых культур склаў 30 цэнтнераў з гектара, а бульбы — 260 цэнтнераў.

М. Сідарук з аднаго гектара ўгоддзяў прадаў 250 кілаграмаў жыўца і 910 літраў малака.

На гектар угоддзяў прымяняе ён у сярэднім 250 кілаграмаў НПК і прадукуе 20 кілаграмаў квашонкі.

Фота А. Карпюка



Мікалаю Сідаруку ўручаюць дыплом перадавога гаспадара — пераможцы ў конкурсе «Беластоцкая вёска гаспадарная і культурная».

Усенародная падтрымка

Заклік партыі адносна ўтварэння народнага фонду аховы здароўя знайшоў усенародную падтрымку. На рахунку гэтага фонду ў нашай краіне да канца лютага налічвалася больш як 330 мільёнаў зл. Шмат прадпрыемстваў, а таксама прыватных асоб перадаюць на гэты фонд свае складчыны і прымаюць рознага роду абавязацельствы.

У Гайнаўцы 42 прадпрыемствы, у якіх працуе 5.496 чалавек, задэкларавалі 567665 зл. у год. Пераважна дэкларуюць людзі па 0,5% ад заработнай платы.

130 рамеснікаў Гайнаўкі абавязаліся плаціць 3% ад сумы плачаных падаткаў.

У Гайнаўцы ёсць людзі, якія маюць гаспадаркі. Сярод іх 220 гаспадароў падпісала дэкларацыю аб уплачванні грошай на народны фонд аховы здароўя. (мх)



Ехаў я ў Саколку. За Васільковам у цені Букштэльскага лесу белай коўдрай ляжаў яшчэ снег. І тут усё згаджалася з календаром, які ў той дзень апавяшчаў свету чатырнаццаты дзень сакавіка. Аднак на адкрытым полі не было ўжо ані следу снегу. Шэрыя загоны зямлі і зялёныя ўчасткі азіміны чакалі рук гаспадароў, а ў ясных сонечных праменнях, што зіхатліва адбіваліся ад лагчын, запоўненых вадою, адчуваўся подых наступаючай вясны.

У мяне ў партфелі была скарга на аднаго з загадчыкаў «кулковай» тэхнікі на Сакольшчыне. За паясненнямі трэба было звярнуцца да яго начальніка. Старшыня Павятовага саюза сельскагаспадарчых гурткоў у Саколцы Генрык Мірон без энтузіязму прыняў у сваім кабінеце пранырлівага журналіста. Не адрываючыся ад тэлефоннай трубкі, ён гаварыў:

— Гэтых «кулкаў» маю я вышэй носа, во так! — і пацягнуў далонню на вышыні вачэй. — Кожны тыдзень па некалькі кантроляў. Кожнаму паясняй, кожны патрабуе, але вось запасных частак да сельскагаспадарчых машын, асабліва да гэтых болей складаных, няма каму даставіць. Нашыя механікі ездзяць па цэлай Польшчы і з пустымі рукамі назад вяртаюцца.

Я добра не ведаў, ці старшыня звяртаецца да мяне, ці да таго, хто на другім канцы тэлефоннага праваду. Адклаўшы трубку, ён глянуў на мяне.

— А, вы з гэтай скаргай! — зірнуў на гадзіннік. — Праз дзве мінуты я абавязаны адкрыць нараду дыспетчараў міжгурткоўскіх машынна-трактарных баз і сельскагаспадарчых гурткоў. Дарэчы, вы гэтага з Гуран таксама там сустрэнеце. Мы будзем гаварыць аб гатоўнасці да веснавога сезона палявых работ. Дык калі ласка, бо я ўжо...

Прапанова мне спадабалася, і такім чынам апынуўся я сярод амаль васьмідзесяці чалавек з усяго Сакольскага павету, ад якіх у значнай ступені залежаць вынікі гэтага года ў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Нараду вёў старшыня Мірон, побач яго сядзеў сакратар па сельскагаспадарчых справах павятовага камітэта партыі ў Саколцы тав. Анатоль Цішэўскі, а далей — «кулковыя» загадчыкі і дыспетчары, «афіцэры» сельскагаспадарчай механізацыі. Сярод іх — многа яшчэ зусім маладзенькіх, як той Міхась Ярош з Крушынян, і даваенных ветэранаў сельскагаспадарчай прадукцыі, як Рыгор Турыч з Гуран, або Чыжэўскі з Саколкі.

Усе яны добра ўжо разумеюць, што ў сучасны момант на добры плён складаецца шмат розных мерапрыемстваў: вапнаванне глебы, запраўка пасяўнога збожжа, згоднае з нормамі прымяненне штучных угнаенняў, хімічная праполка пустазелля, безаварыйная праца машын і ўзаемная добразычлівасць людзей. Усе гэтыя прадстаўнікі сельгасгурткоў і МБМ-аў, якія сабраліся ў Саколцы, непасрэдна дакранаюцца да гэтых спраў уласнымі рукамі.

Дык пра гэта ўсё ішла гутарка ў час нарады. Гатоўнасць сельскагаспадарчай тэхнікі да вясенняй акцыі ў Сакольскім павеце ўстаноўлена была на пачатак сакавіка. Устаюць прадстаўнікі паасобных «кулкаў» і МБМ-аў і рапартуюць, як у войску, коратка і канкрэтна, што цяпер дзеецца ў іх вёсках. З іх рапартаў складаецца вывад, што сельскагаспадарчая тэхніка на Сакольшчыне ў палавіне сакавіка была ўжо амаль гатова выканаць паверана ёй абавязкі.

Чаму аднак «амаль»?

Бо здараліся розныя, часам нават смешныя, непаладкі. Вось нідзе на Сакольшчыне і ў суседніх паветах не можна атрымаць звычайных зубоў культыватараў, не хапае адблясковых трохвугольнікаў, без якіх нельга выехаць на дарогу, бо міліцыянеры адразу «прышпораць» не менш 100-залатовы штраф, няма дробных шрубаў і мутраў, без якіх таксама нельга абыйсціся ў працы машын. Сакольскі ПЗГС, паведамляючы аб напраўе запасных частак, не інфармуе дакладна, якія канкрэтна часткі мае на складзе, дык без патрэбы вандруюць людзі ў Саколку і назад, і найчасцей не атрымоўваюць таго, што найбольш ім неабходнае. Не хапае ў павеце звыш 30 трактарыстаў.

Сакратар Цішэўскі і старшыня Мірон штораз спыняюць выказванні выступаючых, патрабуючы ад іх дакладных фактаў.

Справа найважнейшая: прымяненне мінеральных угнаенняў. План на гэты гаспадарчы год для Сакольскага павету прадугледжвае 102 кг хімічна чыстага рэчыва азоту, фосфару і калію (патасу) на кожны гектар пасеваў. Узровень высокі і ў практыцы Сакольшчыны небывалы. На канец месяца люты сяляне Сакольскага павету купілі не многа больш за 60 прац. сваёй нормы.

— Сяляне будуць яшчэ купляць штучныя ўгнаенні ў красавіку, калі будуць яны крыху таннейшыя, — інфармавала мяне маладзенькая працаўніца сакольскага ПЗГС-у Чэся Ляўіцкая, якая там адказвае за продаж штучных угнаенняў. Аказваецца аднак, што не хапае патройнага суперфасфату, які сяляне найбольш ахвотна купляюць. І пані Чэся не ведала, чаму яго няма.

— План па ўгнаенні, — звяртаўся сакратар Цішэўскі да прысутных у зале, — у што б там ні стала, мы мусім выканаць! Вапнаванне і ўгнаенне — цяпер найважнейшыя праблемы. Ужо заўтра, паслязаўтра — трэба ў поле. Пакуль трымае груда — рассяваць вапну і вясеннія дозы мінеральных угнаенняў. Нельга чакаць!

Так, сапраўды — нельга чакаць! Подых вясны кліча гаспадароў у поле.

М. Нурэцкі



Нашаніўская пара

«НАША НІВА» Ў АЦЭНКАХ КРЫТЫКАЎ — ЧАСТКА VII

Сёння хацелася б пазнаёміць чытачоў з выказваннямі аб «Нашай ніве» яшчэ аднаго пісьменніка, якога крытыкі залічваюць да апазіцыйнай групы ў складзе рэдакцыі часопіса. Пісьменнікам гэтым з'яўляецца Змітрок Бядуля. Бядуля прайшоў складаны шлях, які прывёў яго ў канцы канцоў у беларускую літаратуру. Бядуля з паходжання быў яўрэем. Выхоўваўся ў тыповай для тагачаснага яўрэйскага маламестачковага асяроддзя атмасферы. Асновай яго выхавання была біблія і пераканане аб місійнай ролі сусветнага яўрэйства. З другога боку, развіццё Бядулі залежала ад рускай культуры і рускай літаратуры, якія дамінавалі ў тагачаснай Беларусі. І ўрэшце Бядуля-юнак падлягаў пад уплыў беларускага асяроддзя. Кантактаваўся з беларускімі дзецьмі, ведаў беларускую мову і беларускі фальклор. Першыя паэтычныя парывы завялі Бядулю ў яўрэйскую і рускую паэзію. Пачаў ён пісаць па-яўрэйску і па-руску. Некаторыя яго рускія вершы былі апублікаваны ў пецярбургскім часопісе «Нева». Пасля аднак перамагла беларуская стыхія. Бядуля пачаў пісаць па-беларуску, і ў працэсе развіцця яго беларускай творчасці і распаўсюджвання яе сярод беларускага насельніцтва рашуча станоўчую ролю адыграла «Наша ніва». Першыя беларускія творы Бядулі паявіліся на старонках «Нашай нівы» ў 1910 годзе. І гэты момант акрэсліў лёс Бядулі-пісьменніка. Стаў ён на ўсё жыццё пісьменнікам беларускім. На працягу стагоддзяў таленавітыя беларусы ішлі на службу іншых нацыянальнасцей. На гэты раз да беларускай культуры далучыўся прадстаўнік іншага народа. Няма сумненняў, што сталася гэта дзякуючы, між іншым, «Нашай ніве». Момант, звязаны з друкам першых твораў Бядулі на старонках «Нашай нівы», знайшоў месца ў аўтабіяграфіі пісьменніка. Паслухайма паэта: «Первым моим произведением на белорусском языке была импрессия «Поют ночлежники», напечатанная в «Нашей ниве» в 1910 году (по-белорусски «ночлежниками» называются крестьяне, которые ночью пасут лошадей). Два года подряд я печатал в этой газете корреспонденции из крестьянского быта. Первый рассказ «Молитва маленького Габрусика» был напечатан в «Нашей ниве» в 1912 году».

Амаль усе крытыкі — прыхільнікі погляду аб двух ідэйных лагерах у «Нашай ніве» сярод правага крыла часопіса знаходзяць В. Ластоўскага. Не займаемся тут рэабілітацыяй Ластоўскага і не акрэсліваем яго поглядаў. Няма ў нас матэрыялаў, якія дазволілі б акрэсліць ідэйны твар Ластоўскага. З гэтай прычыны абсалютна не выступаем супраць тых крытыкаў, якія адмоўна адносяцца да Ластоўскага. Хочам толькі падкрэсліць, што аўтабіяграфічныя матэрыялы беларускіх пісьменнікаў не пацвярджаюць погляду аб варожых адносінах гэтых пісьменнікаў да Ластоўскага. Матэрыялаў такіх не знаходзім і ў аўтабіяграфіі Бядулі. Наадварот, фрагменты гэтай аўтабіяграфіі сведчаць аб станоўчай ацэнцы, якую даваў Бядуля Ластоўскаму. Зрэшты, хай скажа аб гэтым сам Бядуля: «И вот после напечатания этого рассказа («Малітва маленькага Габрусіка» — А. Б.) произошло очень большое событие в моей жизни: редакция газеты «Наша нива» пригласила меня в Вильно на постоянную работу. Я, конечно, сразу согласился. Секретарь редакции В. Ю. Ластовский (теперь непременный секретарь Института белорусской культуры в Минске) принял меня, как родного».

Паслухайма яшчэ, як ацэньвае Бядуля атмасферу, створаную ў рэдакцыі «Наша ніва», як ацэньвае тых дзеячоў, якія працавалі ў рэдакцыі і якія былі членамі «Беларускай сацыялістычнай грамады». Людзей гэтых называе Бядуля сябрамі, барацьбітамі за класавыя і нацыянальныя ідэі. Няма сумненняў, што Бядуля мае на думцы не Коласа, не Купалу і не Багдановіча, бо пісьменнікі гэтыя не былі членамі БСГ, а толькі Ластоўскага, Бурбіса, Луцкевіча і Цётку — актыўных дзеячоў «Беларускай сацыялістычнай грамады». Вось словы Бядулі: «Настоящую школу самообразования я проходил в Вильне, в среде своих сотоварищей, сотрудников «Нашей нивы», с которыми я и дальше поддерживаю самую тесную дружескую связь. Многие из них жили на нелегальном положении, будучи членами «Белорусской социалистической громады». За редакцией вечно следили жандармы. Я считал себя счастливым, так как попал в народную белорусскую среду борцов за классовые и национальные идеи; действительное значение этих идей я понял именно тогда, когда работал в редакции газеты «Наша нива».

ГОНАР І ДАСЯГНЕННІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Чарговы раз займаю месца за журналісцкім сталом вялікай канферэнцыйнай залы Прэзідыума ВРН. Усё, як зазвычай, толькі ўдзельнікі мерапрыемства нейкія іншыя, незвычайныя. Гэта найлепшыя гаспадары Беласточчыны. Запрасілі іх партыйныя і адміністрацыйныя ўлады, каб супольна падсумаваць конкурс «Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная». Многа іх тут сабралася. Усе па-святочнаму апрануты, пабрытыя. Цяжка пазнаць нават тых, у якіх бываў дома, з якімі гутарыў.

На ўрачыстасць прыбылі дастойныя госці, а сярод іх член Палітбюро ЦК ПАРП віцэ-прэм'ер Юзэф Тэйхма, член ЦК ПАРП, І сакратар Ваяводскага камітэта ПАРП Здзіслаў Куроўскі і старшыня Прэзідыума ВРН Зыгмунт Спрыха.

Што даў конкурс, кожны з гэтых гаспадароў дасканала ведае, ведаюць і ўлады, паколькі вылічальныя машыны ўжо даўно падлічылі сярэднія. Аднак усе з зацікаўленнем слухаюць даклад і выступленні, слухаюць, бо ўжо яны пачуліся адной сям'ёй найлепшых, адчулі, што з'яўляюцца гонарам сельскай гаспадаркі Беласточчыны.

У конкурсе «Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная» ў мінулым годзе прыняло ўдзел 9,5 тысяч гаспадароў і 1966 вёсак, у якіх налічваецца каля 76 тысяч гаспадарак. Гэта сведчыць аб вялікім зацікаўленні спаборніцтвамі. Аднак лічыліся тут канкрэтныя, добрыя вынікі ў гаспадарцы, а такімі магло выказацца 1779 узорных гаспадароў, а асабліва 575 майстраў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Дасягненні гэтых апошніх сапраўды вялікія. У сярэднім з кожнага гектара сабралі яны: 31,8 цэнтнера збожжа, 283 цэнтнеры бульбы, прадалі дзяржаве па 324 кілаграмы мяса і каля 1.100 літраў малака. Віцэ-прэм'ер Ю. Тэйхма ў час свайго выступлення сцвердзіў, што перадавыя гаспадары дасягнулі добрых, а нават выдатных вынікаў у сельскай гаспадарцы, якія цэняцца не толькі ў нашым ваяводстве, але і ў краіне.

Зразумела, гэтыя добрыя вынікі майстроў сельскагаспадарчай прадукцыі дасягнуты дзякуючы сучаснай і рацыянальнай агратэхніцы, а перш за ўсё — багатаму ўгнаенню. Ужо сёння майстры ў сярэднім высяваюць па 275 кілаграмаў NPK на адзін гектар угоддзяў. Ёсць шмат такіх, якія высяваюць па 500 кілаграмаў. Напрыклад, Уладзімір Тымашыцкі са Шчытоў-Навадворцаў у Бельскім павеце на пашу высявае 630 кілаграмаў на адзін гектар. Зразумела, такія высокія даўкі патрабуюць майстэрства, ведаў, як, калі і па колькі высяваць. Тымашыцкі на 1,5 гектара пашы пасе 16 штук кароў, а апрача таго ў мінулым годзе сабраў 10 тон травы на сілас, а 5 тон на сена. Не верыце? Паедзьце і пабачыце ўласнымі вачыма.

Цікавыя вынікі атрымалі гаспадары, спаборнічаючыя за званне ўзорнага гаспадара. Кожны з іх мусіў дасягнуць не горшых вынікаў, чым 25 цэнтнераў збожжа, 220 цэнтнераў бульбы з аднаго гектара, а таксама 70 штук жывёлы і 95 штук свіней, пералічваючы на 100 гектараў угоддзяў.

Пры гэтым трэба дадаць, што ў мінулым годзе ўраджай збожжа ў нашым ваяводстве склаў у сярэднім 22,2 цэнтнера з аднаго гектара, бульбы — 207 цэнтнераў, а з кожнага гектара ўгоддзяў скуплена ў ваяводстве 82 кілаграмы мяса і 282 літры малака.

Параўнанне вынікаў перадавых гаспадароў і сярэдняй ваяводскай даказвае, якія вялікія рэзервы крыюцца ў беластоцкай сельскай гаспадарцы, у кожнай вёсцы, у кожным гектары зямлі. Як жа кантрастуе прадукцыя адстаючых гаспадароў з гаспадаркамі такіх, як У. Тымашыцкі са Шчытоў, Г. Назарук, У. Куптэль, ці В. Плева з Ягаднікаў, М. Лаўрыновіч з Пасечнікаў, В. Астапковіч з Чаромхі ці хаця б А. Лісоўскі з Зубава. А палі ж і гаспадаркі перадавых і адстаючых часта цераз мяжу, па-суседску.

Конкурс «Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная» працягваецца і ў гэтым годзе. Гаворачы аб мінулагоднім, тав. З. Куроўскі сказаў: «Ацэнка ходу конкурсу ўмацоўвае нашае перакананне, што з'яўляецца ён істотным стымулам для развіцця грамадска-эканамічнай актыўнасці, распаўсюджвае высакароднае спаборніцтва на званне найлепшых гаспадароў Беласточчыны. З такім перакананнем аб'яўляем сёлетні конкурс для вёсак і гаспадароў нашага рэгіёну. Я перакананы ў тым, што яго тэматыка будзе ўзбагачана новымі ініцыятывамі жыхароў вёсак і работнікаў абслугі сельскай гаспадаркі».

А вось некаторыя інфармацыйныя даныя аб мінулагоднім конкурсе. У конкурсе ўдзельнічала 56 прац. вёсак. Найменш вёсак прымала ўдзел у конкурсе ў Бельскім і Сакольскім паветах. Узнагародзіла 109 вёсак, выдаткоўваючы 5,5 мільёна зл. Першая ваяводская ўзнагарода не была прызнана, таму што былі збежныя вынікі ў некалькіх вёсках. Па 150 тысяч зл. узнагароды атрымалі вёскі: Бэнцькова, Граеўскі павет, Яварроўка, Беластоцкі павет і Вышомеж, Замброўскі павет. Па 100 тысяч зл. узнагароды атрымалі: Сухавольцы Гайнаўскага павету, Вінна Хролы Сямяціцкага павету, Ляўданшчызна Дуброўскага павету і Пшэстшэле Ломжынскага павету.

Вышэй сказанае хацелася б закончыць словамі віцэ-прэм'ера Ю. Тэйхмы: «Партыя і ўрад высока цэняць дасягненні беластоцкіх гаспадароў... А гаспадары, атрымліваючы такія вынікі, будуюць свой аўтарытэт і прэстыж. Сваёй працай, а асабліва дынамікай вы заслужылі на званне гаспадароў Цэнтральных дажынак».

А. Карпюк

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

ВЯСЕЛЬНАЯ

Moderato



Ой, чы світ, чы сві-та-е, Чы на зо-ры зай-ма-е?



Чы мой мі-лень-кі, го-луб сі-вень-кі ко-ні-ка а-сед-ла-е?

Ой, чы світ, чы світае,
Чы на зоры займае?
Чы мой міленькі, голуб сівенькі
Коніка аседлае?
Чы мой міленькі, голуб сівенькі
Коніка аседлае?
Асядлай, мілы, коня,
Асядлай варанога.
Прыезджай, мілы, забірай, мілы,
Міне маладзенькую.
Прыезджай, мілы, забірай, мілы,
Міне маладзенькую.

Ад Зоф'і Марцінчык, 1921 года нараджэння, вёска Меляшкі, Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.



У Беластоку дзейнічаюць тры жыллёвыя кааператывы. Адным з іх, наймалодшым у гэтай сям'і, з'яўляецца жыллёвы кааператыў «Сям'я чыгуначніка». Назва «Сям'я чыгуначніка» завужвае паняцце дзейнасці кааператыва, быццам будуе ён кватэры толькі для чыгуначнікаў. А гэты ж кааператыў дзейнічае на тых самых правах, што і ўсе іншыя жыллёвыя кааператывы, і дае ён кватэры для ўсіх. Назва прынялася ад першага сходу, на якім заснавальнікамі яго былі перш за ўсё чыгуначнікі.

Кааператыў «Сям'я чыгуначніка» мае ўжо сваю дзесяцігадовую гісторыю. Першы жыллёвы будынак перaказаў ён у карыстанне ў 1961 годзе на пасёлку пад назвай «Прывакзальны». Пяць гадоў пазней кааператыў пачаў будаваць дамы на новым пасёлку «Антанюкоўскія сады» і да 1960 года пабудаваў іх тут 13. На працягу першых дзесяці гадоў існавання кааператыў чыгуначнікаў пабудаваў 20 блокаў. Цяпер на пасёлку «Прывакзальным» кааператыў мае 891 кватэру і на пасёлку «Антанюкоўскія сады» — 1290 кватэр. Разам 2181 кватэру ў 31 блоку. Жыллёвыя пасёлкі кааператыва чыгуначнікаў прыгожыя, цікава размешчаныя і чыстыя. Жыхары іх маюць на месцы рэстараны, кавярні, розныя пункты паслуг, гандлёвыя павільёны. Лік іх з году ў год павялічваецца, бо растуць пасёлкі. Кааператыў налічвае ў сучасны момант больш пяці тысяч членаў і больш тысячы кандыдатаў. Значыць, трэба яму многа будаваць.

Аднак у дзейнасці жыллёвага кааператыва лічыцца таксама грамадска-асветная, культурная і выхаваўчая работа, якая вядзецца сярод жыхароў кааператыўных пасёлкаў. Кааператыў назначае спецыяльна падрыхтаваных работнікаў для вядзення культурна-асветнай работы сярод дзяцей і дарослых. Гэтыя мерапрыемствы адбываюцца ў святліцах. Дзейнічаюць тут шматлікія гурткі: вакальна-музычны, танцавальны, мадэльшчыкаў і іншыя. Арганізуюцца культурныя мерапрыемствы з такіх нагод, як дзяржаўныя святы, а таксама танцавальныя вечарыны, навагоднія балі, кулігі. Арганізуюцца таксама курсы, на якіх вучацца, як карыстацца сучаснай тэхнікай у хатняй гаспадарцы.

Жыхары пасёлкаў і ўвесь актыў кааператыва многа працуе грамадска пры пабудове вуліц, напрыклад, Сталічнай, Суконнай, Нараўскай і іншых, пры пабудове прадшколля, пракладцы ходнікаў, пабудове спартыўных пляцовак, пасадцы дрэў, кустарнікаў, кветак і г.д. У гэтай галіне ў міжкааператыўным спаборніцтве «Сям'я чыгуначніка» заняла першае месца за мінулы год і атрымала грашовую ўзнагароду. Асабліва многа пасаджана дрэў і кветак на новым пасёлку «Антанюкоўскія сады». У спартыўных спаборніцтвах між паасобнымі кааператывамі члены кааператыва чыгуначнікаў занялі ў 1972 годзе заслужанае другое месца ў агульнай пунктацыі, а ў некаторых відах спорту нават некалькі першых месцаў. Многа для агульнага дабра працуюць: Марыя Кертовіч, Павел Пятроўскі, Адам Манкевіч, Пётр Наўроцкі, Генрык Кендысь, Антон Мінкевіч, Марыя Сакульская, Станіслава Астроўская, Ядвіга Матэля, Аліцыя Гамолік і іншыя. Дзякуючы шматасабоваму і ахвярнаму актыву кааператыў мае вялікія дасягненні ў грамадскіх працах і на культурна-выхаваўчай ніве.

— У гэтым годзе наш кааператыў, — гаворыць старшыня кааператыва Васіль Місеюк, — перадасць ключы да ўласных кватэр 377 сем'ям, на пасёлку «Антанюкоўскія сады», будзе перададзены да агульнага ўжытку клуб «Рух». На будучыню нашыя інвестыцыйныя намеры не менш амбітныя. Яшчэ сёлета пачнем весці пабудову дамоў у рамках ЗМС-аўскага патранату.

Тэкст і фота Янкі Цялушэцкага



Танцавальны калектыў, які вядзе харэограф Валя Жэшка.



Вось такія жылыя дамы будуе кааператыў «Сям'я чыгуначніка».

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ УНІВЕРСАЛЬНЫМ МАГАЗІНЕ „МІНСК"

Цэнтральны універмаг «Мінск» размясціўся на галоўнай магістралі беларускай сталіцы — Ленінскім праспекце. Плошча ўсіх яго гандлёвых залаў складае 5 тысяч квадратных метраў, гэта значыць роўна паўгектара. Тут заўсёды многалюдна, ажыўлена і прыгожа. Дырэктар магазіна Георгій Сухій ахвотна дае нам спраўку:

— У сярэднім да нас прыходзіць штодзень 60 тысяч пакупнікоў. У мінулым годзе, напрыклад, магазін прадаў тавараў на суму 75 мільёнаў рублёў. Такой лічбай акрэсліваецца наш тавараабарот. Чым гандлюе універмаг? Гэта — абутак, швейныя вырабы, тэкстыль, трыкатаж, галантэрэя, пасуда, тавары гаспадарчага і культурнага абіходу — усяго больш 10 тысяч назваў і сартоў.

— Што ўваходзіць у гэта паняцце?

— Хуткасць і якасць абслужвання, — гаворыць тав. Сухій. — Не сакрэт, што хаджэнне па магазінах адбірае ў людзей нямала часу. Гэта праблема стаіць перад розничным гандлем ва ўсіх краінах. Шлях яе вырашэння — механізацыя дапаможных прац, рацыянальная арганізацыя працэсу продажу, правільнае размяшчэнне тавараў, усебаковы ўлік запатрабавання, добра пастаўленая інфармацыя. Усе гэтыя задачы даволі складаныя, і за апошні час мы ўсё часцей звяртаемся да электронна-вылічальных машын.

Некалькі гадоў назад сярэднія затраты часу на адну пакупку складалі ва ўнівермагу 10 мінут, а цяпер — усяго чатыры мінуты. Агульная эканомія часу за год склала 1.650.000 гадзін.

Мы ўзялі сабе за правіла, каб кожны пакупнік выходзіў з нашага магазіна задаволены, — працягвае таварыш Сухій. — Справа не ў тым, каб нагаварваць пакупніка, паніжацца перад ім. Не. Мы выходзім з таго, што прадавец — гэта сябра, дарадчык, кансультант, праваднік пакупніка. У гэтым духу і працуюць нашы прадаўцы.

Калектыў універмага налічвае амаль тысячу чалавек. Каля паловы з іх маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю, іншыя закончылі поўную ці няпоўную сярэднюю школу. Каля ста чалавек працуе вучобу без адрыву ад працы, сталі студэнтамі гандлёва-эканамічных інстытутаў і тэхнікумаў.

Барыс Усцінаў
фота В. Казлова



Будынак Цэнтральнага універсальнага магазіна «Мінск».



У адной з залаў універмага.



ДОМ ВЯСЦІ: — НЕ ЗАДАМ ТРАСЦІ!

ЯК ЗМАГАЦЦА З МОЛЛЮ?

Ці ж гэта рэдка здараецца ў маладых, нявопытных гаспадынь? Паедзе чалавек у водпуск, загарае і купаецца ў моры, жыве (як хто любіць) у спакоі ці вясёласці, а тут прыедзе дамоў (поўны радасных надзей на сустрэчу з сябрамі і блізкімі) — а ў хаце расчараванне. Небяспечны матылёк з'еў найлепшую візітовую сукенку, якую маладая гаспадыня шкадавала ўзяць з сабою на «участы». Добра яшчэ, калі толькі адну сукенку. А што калі моль дарвалася і патачыла мужаў касцюм, пасажную падушку, модны кажушок?!

Можна тады ўявіць сабе здзіўленне і роспач маладой гаспадыні, якая восенню загляне ў куфар, ці шафу.

Старэйшыя гаспадыні найчасцей ведаюць, што ў гэтым выпадку зло лепш папярэдзіць. Што ж яны робяць, каб у іх кватэрах не было такіх неспадзевак? Зразумела, што калі лётаючыя стварэнні паяўляюцца ў кватэры, позна ўжо з імі змагацца, зрэшты, наш дамашні працаўнік ужо тады не такі страшны. Найбольш небяспечная моль бывае ў той перыяд, калі са зложаных яечак выводзіцца маленькія чарвячкі — яны якраз з'яўляюцца найбольш ненасытнай (у адносінах да нашай вопраткі) пасцюцю молі. Менавіта яны могуць пасеяць спусташэнне ў нашым гардэробе. Таму вывад: нельга дапусціць да таго, каб моль наогул злажыла ячэйкі.

Чаго ж найбольш не любіць моль? Чым яе найлягчэй можна адстрашыць? На гэта пытанне ёсць вельмі лёгкі адказ: моль баіцца чысціні і моцных запахаў.

Таму ўсе зімовыя рэчы трэба памыць дома (альбо ў хімічнай пральні) не надта шчыльна злажыць у куфар ці чамадан, або павесіць у шафу. Большасць гаспадынь перасыпае вопратку нафталінам (і тады гэтая вопратка вельмі дае цца прахожым у знакі, калі яны выйшлі на нядзельны шпацыр), можа, лепш было б прымяняць «Molotoks», ён мае менш востры запах, а вынік — не горшы.

Але, кажуць, ёсць яшчэ адзін сродак, бадай, найпрыемнейшы ў барацьбе з моллю. Вопытныя гаспадыні прымяняюць яго паспяхова на працягу многіх год. Увясной яны робяць больш запас туалетнага мыла з моцным запахам. Мыла, зразумела, без упакоўкі кладуць у чыстыя рэчы — прызначаныя на летні адпачынак паліто, футра, кажухі вешаюць на вешалкі, надзяваючы на іх нейлонавыя ці з паперы мяшкі, а ўнізе мяшкоў кладуць мыла, кладуць яго таксама ў сярэдзіну і кішэні вопраткі.

Молі тады не будзе, а вопратка наша будзе мець прыемны пах.

Гаспадыня



Брыдучы па дарозе, Мартынаў абдумваў, што расказаць у лагеры. На скраі лесу ён націснуў на спускавы кручок свайго аўтамата і напалову спаражніў дыск, а гільзы раскідаў па баках. На маленькім балотцы крышачку папоўзаў на жываце. Калі ён вярнуўся да Будэра і Франке, адзенне яго было запэцкана граззю, а дула аўтамата пачарнела ад парахавога дыму. Немцы здзіўлена ўтаропіліся ў яго. Будэр запытаў:

— Што здарылася? Дзе обер-лейтэнант?

Мартынаў у знямозе паваліўся на траву. Расказваючы, ён так хваляваўся, што ледзь варушыў языком: падпільнавалі варожы патруль, калі яны ішлі па паляне. Вораг не адразу зразумеў, хто яны такія, і магчыма, усё скончылася б добра і ім удалося б дабегчы да дрэў, каб Альтэнкірх не пачаў страляць: рускія таксама адкрылі агонь і яны з Альтэнкірхам адстрэльваліся.

— Раптам у Альтэнкірха трапілі тры кулі — вось сюды, сюды і сюды. Ён адразу памёр, а я схаваўся ў гушчары.

— Можа вы навялі рускіх на наш лагер? — з трывогай запытаў Будэр.

— Што вы! Спачатку я бег у адваротным напрамку. Потым пачаў кружыць па лесе, бег зігзагам.

— Вы самі бачылі Альтэнкірха мёртвым? — задаў пытанне Франке.

Мартынаў глянуў яму ў твар і зразумеў, што Франке не верыць яго словам. У вачах Франке не было насмешкі, варожасці альбо недаверу — толькі перакананасць, што на самай справе усё было інакш. Мартынаў адчуў, што не ў яго сілах рассеяць гэту перакананасць, але рашуча прамовіў:

— Так, ён мёртвы.

Гэта была праўда, і таму голас Мартынава прагучаў цвёрда і ўпэўнена.

— Адным менш, — нібыта канстатуючы факт, прамовіў Франке.

Будэр здзіўлена ўскінуў на яго вочы:

— Без яго нам горш, — сказаў ён і сам падумаў: «Я таксама па ім не плачу. За гэтыя дні мы з ім сябрамі не сталі. Магчыма, нават і як чалавек ён быў мне агідны. Аднак нельга ж так гаварыць пра баявых таварышаў». — У нашым становішчы кожны чалавек мае значэнне, — уголас сказаў ён. — Чатыры нас ці пяць — гэта не адно і тое ж. Галоўнае ж тое, што цяпер рускія ведаюць, дзе прыблізна хаваемся.

— Але яны нас усё роўна не знойдуць, — упэўнена прамовіў Франке.

Вайтхазе вярнуўся наступнай ноччу. Моўчкі выслухаў расказ Мартынава і Будэра пра самавольную адлучку Альтэнкірха і яго смерць. Ён стрымаў сябе і ні словам не асудзіў загінуўшага афіцэра.

— Сёння ж давядзецца мяняць месца. Тут заставацца небяспечна, — рашыў ён.

Перш чым зняцца з лагера, Будэр перадаў па рацыі доўгую радыёграму. Ён паведаміў, што за апошнія ночы дванаццаць самалётаў скінулі груз і баяздольнасць групы Грэльхамера вырасла. «Удары баявых груп на паўночны захад, — радзіраваў Будэр. — Узарваны чыгуначныя пуці ў дваццаці двух месцах, знішчана пяць паравозаў. Спалены тры масты. Супраць нас падцягнуты новыя сілы — 162 і 356 пяхотныя дывізіі. Тэрмінова патрэбен урач, перавязачны матэрыял, эфір, антытаксін, міны, узрыўчатка, боепрыпасы для пяхотнай зброі ў дысках і россыпам. Прадстаўляю оберфенрыхса Пагеля да звання лейтэнанта і рыцарскага крыжа. У першы тыдзень акружэння ён гераічна стрымліваў пераўзыходзячыя сілы працўніка, даўшы нашай групе магчымасць правадзіць з небяспечнага месца ў цяперашняе наша размяшчэнне. У наступныя дзве ночы сігнальныя вогнішчы ўтвораць раўнабедраны трохкутнік, потым зноў прамавугольнік».

Да радыёграмы Вайтхазе загадаў дадаць: «Загінуў обер-лейтэнант Альтэнкірх». У канцы сеанса сувязі Будэр перадаў свой асабісты код і пароль.

Ноччу рушылі на поўнач. Ношы іх сталі лягчэйшыя, таму што харчу было ўжо менш. Большая частка прадуктаў, якія былі скінуты з «Фоке-Вульфа», засталася ў раёне прызямлення. Харч быў добра схаваны, але яны вельмі далёка адышліся ад таго месца, і цяпер ён быў для іх недасягальны. Тое, што яны цяпер неслі на сабе, хопіць ім можа на які тыдзень, а потым яны будуць есці тое, што атрымаюць ад Грэльхамера. Пайкі там мізэрныя, паведаміў Вайтхазе. Такая перспектыва азмрочыла настрой Будэру не менш, чым смерць Альтэнкірха. Як і раней, калі даводзілася мяняць лагер, ён цягнуў на плячах рацыю, але гэтай ноччу яна здалася яму непасільнай. Першы раз пасля таго, як іх скінулі з самалёта, яму да жудасці захацелася, каб усё гэта хутчэй ужо скончылася. Але яго пачалі адольваць сумненні, ці ўдасца наогул выбрацца адсюль. Дзе можа ў гэтай лясістай мясцовасці прызямліцца самалёт? А нават калі і знойдзецца дзе-небудзь пасадачная пляцоўка, на самалёты ў першую чаргу пасадзяць параненых, яго ж возьмуць апошнім, бо ён адзіны чалавек, хто звязвае групу Грэльхамера з фатэрландам. Аднак і да гэтага, відаць, ніколі не дойдзе. У першы гады вайны такія аперацыі былі магчымыя — тады багата было самалётаў і бензіну, а жыццё кожнага асобнага салдата было яшчэ чаго-небудзь варта. А што сёння значыць для Германіі нават тысяча дзвесце чалавек?

(Працяг будзе)

ТРЫБУНА чытачоў

Лён Васіля Вярбіцкага

Жыхар вёскі Трасцянка — Васіль Вярбіцкі сумеў выкарыстаць аблогі, якія ляжалі пару год без ніякай карысці. Ён пазычыў у кулку глебагрызалку, аблогі тыя на зіму падзёр, зноў на весну культыватарам паспрэнжынаваў і высеяў удабрэнні, якія падказаў яму аграном. Закантрактаваў 1 гектар ільну і пасеяў яго вясною. Лён узяўся расці, як на дзіва. Зелле гаспадар скрапіў хвастоксам. Калі лён даспеў, сабраў яго і вырабіў валакно. Вельмі прыгожае выйшла валакно! Было яго больш як 10 цэнтнераў. Прадаў валакно па 64 зл. за кілаграм. Вось і падумайце, якую карысць даў аблог, які ляжаў бескарысна! А колькі яшчэ ў нас ляжыць такіх аблогаў?

Анна Стахіюк,
Трасцянка

А вось верш, які аўтар вышэйшай інфармацыі прысвяціў працавітаму гаспадару сваёй вёскі.

За ўмелую працу заспяваем звонка,
Як пры коранкай дарозе
Васілёк з Тамаркай жонкай
Сеялі вясною лён.

Лён зялёны, кучаравы,
Кожнаму патрэбен ён!

Прыляцела на дубочак
Зязюленька кукаваць.
Лён парос усім на дзіва,
Будзем з песняю збіраць.

Лён зялёны, кучаравы
Будзем з песняю збіраць.

24 гады на пошце

Станіслаў Гжыбэк працуе на шудзялаўскай пошце ўжо 24 гады. Спачатку быў пісьманосцам, потым стаў начальнікам. Яго працай задаволены ўлады і людзі. У яго людзі не чакаюць, да іх ён заўсёды адносіцца ўважліва, без ганарлівасці. Таксама добра наладжана ў яго праца і з пісьманосцамі. А. С.

Кансультацыя ЮРЫСТА

Пытанне: Паміж уладальнікам дома і арандатарам узнік спор адносна велічыні кватэрнай платы. Арандатар плоціць па 200 зл. у месяц, а ўладальнік дома дамагаецца 300 зл. і не прымае прапанаванай арандатарам сумы. Ці ўладальнік можа ў гэтым выпадку звярнуцца да суда з патрабаваннем прымусовага высялення арандатара на той аснове, што ён больш чым два месяцы не плоціць за кватэру? Калі так, то якім спосабам арандатар можа гэтаму запабегчы?

Адказ: Той, хто здае кватэру або пакой у наймы, можа патрабаваць прымусовага высялення кватаранта, калі той не заплаціў кватэрнай платы за больш чым два месяцы. Перад гэтым ён абавязаны ў пісьмовай форме папярэдзіць кватаранта і вызначыць яму месячны тэрмін да заплаты кватэрнай платы.

Калі той, хто здае кватэру ў наймы, адмаўляецца прыняць кватэрную плату, наймальнік можа складаць грошы ў судовы дэпазіт. У сэнсе праўным гэта раўназначна з заплатай, і патрабаванне высялення ў гэтым выпадку не будзе абаснавана, хаця існуе спор адносна велічыні кватэрнай платы. Пасля вырашэння гэтага спору судом — наймальнік абавязаны будзе плаціць устаноўленую судом кватэрную плату і, калі яна вышэйшая ад той, якую ён складаў у судовы дэпазіт — далейшае складанне ў дэпазіт заніжанай кватэрнай платы не будзе перашкодай для таго, хто здае кватэру ў наймы, каб патрабаваць прымусовага высялення.

ПАЗНАЁМІМСЯ

Мне 23 гады. Жыву і працую ў Варшаве. З'яўляюся сталым чытачом «Нівы». Кожны яе нумар заўсёды куплю і дакладна чытаю. Вельмі цікаўлюся добрай кніжкай, тэатрам, фільмам, турызмам, сучасным танцам, прыродай і спортам. Хацеў бы падыскутаваць з сяброўкамі і сябрамі, якія маюць падобныя зацікаўленні. Прашу пісаць да мяне на адрас:
Mikołaj Sawicki, ul. Wincentego 87 m. 98, 03-530 Warszawa

А драгамістр пахмяляўся...

У Коматаўцах Беластоцкага павету апрача сельгасгуртка і КГВ няма іншых арганізацый. Загінуў таксама слух і пра клуба-кавярню, якую абяцаў ГС з Гарадка.

Моладзі ў нашай вёсцы сапраўды мала, але, мяркую, можна было б тут нешта стварыць, каб гэтую, якая засталася, адцягнуць ад распусты. Хлопцы і маладыя мужчыны ў нас праводзяць свой час у краме. Ну, а гэта да добрага не даводзіць.

Мо таму ў нас няма нічога, што няма добрай дарогі? Каб яна была, дык і да нас нехта прыехаў бы, і мы б выбраліся да людзей, паглядзелі б, як у іх, даведаліся б аб усім. А тут няма кудою. Ці ж па кожнай справе будзеш выклікаць верталёт?

Жыхары нашай вёскі ўжо колькі разоў дамагаліся пабудовы 3-кіламетровага адрэзка дарогі ў Баброўнікі. У 1971 г. на весну драгамістр нашых дарог, Усціновіч з Мастаўлян, правёў сход. Абяцаў перад усёй публікай, што гэты кавалак дарогі будзе пабудаваны ў першую чаргу. («Адпушчана на гэту мэту 30 тысяч злотых»).

Кажуць: абяцанкі-цацанкі, а ўсім людзям радасць. Так і тут. Абяцаў многа, а не зрабіў нічога. Коматаўскія людзі дружныя, згадзіліся дапамагчы чынам. Дзень чыну быў узгоднены з драгамістрам. Многа людзей выехала з конньмі, далучылася КГВ. Але драгамістр да нас не прыехаў. Мы потым даведаліся, што ён у гэты час пахмяляўся, таму і не мог прыехаць. Людзі самі працавалі цэлы дзень. Колькі тады зрабілі, столькі ёсць дагэтуль. А далей стоп і ні туды і ні сюды. Можа ўрэшце зрушыцца з наседжанага месца наш драгамістр і дапаможа нам. Пара.

Надзея Андрушэвіч,
Коматаўцы

Супольна

У першай палавіне сакавіка гэтага года ў Дакторцах над Нарвай адбылося супольнае шкаленне гмінная актыву ЗСМВ І ЛЗС. Удзельнічала ў ім 40-асабовая група дзяўчат і хлопцаў Бельскага павету.

Аляксандр Раманюк, Дубяжына.



Дарагое «Сэрцайка»!

Пішу я да цябе, «Сэрцайка», яшчэ першае пісьмо і спадзяюся, што ты мне паможаш у маіх клопатах.

Мне споўнілася 17 год. Жыву я ў малой мясцовасці непадалёку ад горада Б. У нашай вёсцы ёсць файныя хлопцы. Адзін з іх мне падабаецца. Ён на два гады за мяне старэйшы. Завуць яго Вацэк. Хадзіла я з ім некалькі месяцаў, а нядаўна ён пайшоў у войска. Праўду кажучы, не заўсёды мы ладзілі, бывала па-рознаму, часам паспрачаемся, пагневаемся, але ненадоўга. Некалькі дзён перад адыходам Вацка ў войска мы ізноў пагневаліся. Так ён і пайшоў. Я вельмі перажываю, што так сталася, вельмі сумую за ім, бо яго кахаю. І не ведаю, што ён мяне таксама моцна кахае. Прашу цябе, дарагое «Сэрцайка», напішы, як паводзіць сябе, калі ён прыедзе ў вёску з войска і я яго ўбачу дзесьці на вуліцы? Што рабіць, каб ізноў было як найлепш? Чакаю парады, за якую буду вельмі ўдзячна.

Марыся з Бельшчыны.

Марыся! Непатрэбна так пераймаешся. Не першы раз гэтак у вас бывала. Разумею, што прыкра, што вы так расталіся. Напэўна Вацэк там у войску сумуе за табой не менш, як ты за ім. У каханні, як сама бачыш, вельмі хутка забываюцца прыкрыя справы. І ні ў лістах, ні пры спатканні да іх вяртацца не трэба. Напэўна ён напіша табе пісьмо, ды не адно, бо да спаткання так хутка не дойдзе. Гэта ж войска, і таму мусіш цярпліва чакаць. Пацешу цябе аднак, што чым даўжэйшае расстанне, тым мілейшае спатканне.

Сэрцайка

ТРАДЫЦЫЯ

У Чэхах Арлянскіх ёсць старая традыцыя. У час вяселля разам з прыданым едуць перабранцы. Яны таргуюцца за сундук. Адбываецца гэта шумліва, весела і смешна. Таргуюцца так, пакуль не дойдуць да згоды.

Тэкст і фота Мікалая Корха.



Пара перабранцаў



Квітней наша кветка!

Хачу табе, «Ніва», вершык напісаці,
Як прыемна твае строчкі для мяне чытаці.
Як цябе чытаю, дык мне так здаецца,
Нібы сонейка вясною да мяне смяецца.
Нібы птушак шчабятанне весяліць мне душу,
Кожны раз ўсе твае строчкі прачытаці мушу.
Бо хоць векам я паджыты і галоўка сіва,
Лепшага не маю шчасця, як ты, мая «Ніва».
Весяліш старых ты, весяліш і дзеці,
Мы за тое цябе любім больш за ўсё на свеце.
Гутарка прыгожа і мілыя словы,
Няма скарбаў даражэйшых беларускай мовы.
Яна наша маці, кладавіць нас спаці,
А як толькі сонца ўзыйдзе, ідзе прабуджаці.
Хуценька ўставайце, на дварэ пагода,
Нат адну хвілінку праспаці нам шкода.
А калі прабудзіць, дадае ахвоты,
Каб мы дружна ўзяліся ўсе да работы.
А калі ахвотна станем ўсё рабіці,
Багацей тады мы будзем усе ў краіне жыці.
Бо мы да работы такое і створаны,
Калі дружна папрацуем, дык і задаволены.
І няхай нам будзе ўсім работа міла,
Каб наша краіна ўсюды нас хваліла.
Каб наша краіна за нас гонар мела,
Каб хутчэй з усіх краін яна багацела,
Каб і хлеба ў ёй было больш за ўсе краіны,
Да таго і малака, масла, саланіны.
І каб нам з другіх краін гэтага не браці,
А каб іншым мы маглі сёе-тое даці.
Каб мы гонару свайго ўсюды не губілі.
І адзін каб аднаго, як сябе любілі.
Каб у нас хутчэй была гэтая хвіліна,
Гэтай кветкай расцвіце наша краіна.

Іван Грыгарук, Клейнікі

Нявыкарыстаныя пашавыя рэзервы

Многа ў нас яшчэ нявыкарыстаных сенажацей і пасбішчаў. Паміж вёскамі Бабікі, Мінкоўцы і Сухінічы (Сакольскі павет) шмат абшару заліта вадой. Ён не кошаны і не выпасены. І ў Хмялеўшчыне многа сенажацей пад вадой. Тое самае і пад Кнышэвічамі. Усе гэтыя сенажаці і пасбішчы ляжаць на спадзе да рэчкі Слоя. Каб зрабіць пропуск вады ў гэту рэчку, многа пашавай тэрыторый асушылася б. Прыбыло б многа сена і травы, павялічылася б гадоўля жывёлы ў гэтых вёсках. Калісь так і будзе, бо ўжо ў плане стаіць адваднене гэтых зямель. А. С.



Юрка Панасюк, Бельск. З дасланых вершыкаў «Вясна» і «Свет», больш спадабаўся другі. Ён больш прадуманы. Пастараемся надрукаваць абодва. Не рыфмуйце толькі «абагрэла» — «прыгрэла».

Пётр Бохенек, Бельск. «Белавежа вясной» лепшая за «Песню аб салдаце». Відаць, таму, што яна перажыта непасрэдна. Таму і яе прапануем у «Парнасік».

Ян Манюшка, Трыпуце. «Вясну» надрукуем.

А. Макаль, Крушыняны. «Сталінград» можам надрукаваць толькі ў скарачэнні. Няма ж сэнсу, напрыклад, пісаць пра Гітлера, што «І па сённяшні дзень не знаюць, дзе схаваўся той фюрэр», калі ўсім вядома, што прыйшоў яму капут у Берліне.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Cierpienia młodego Bohaczka" (czeski), 10—11. „Dziewczyna inna niż wszystkie" (ang.), 12—13, „Szczęście Anny" (rumuński), 15—15.

Нараўка
„Zaraza" (polski), „Żandarm z gór" (bułg.), 11—15.

Нарва
„Ballada o Cable u Hugue'u" (USA), „Zdobywcy nieba" (radz.), 11—15.

Чыжы
„Dzikie dziecko" (franc.), „Dawid Copperfield" (ang.), 11—15.

Дубічы Царкоўныя
„Przez pustynię" (meksykański), „Szerokiej drogi, kochanie" (polski), 11—15.

Арэшкава
„Życie rodzinne" (polski), „Sprawa trzynastu" (radz.), 11—15.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„12 krzeseł" (radz.), „Perła w kornie" (polski), 11—15.

Орля
„Agnieszka 46" (polski), „Don Gabriel" (polski), 11—15.

Райск
„Polonez Ogińskiego" (radz.). „Ucieczka w milczenie" (NRD), 11—15.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Polonez Ogińskiego" (radz.), „Poszukiwanie" (hiszpański), 11—15.

Янаў
„Woda życia" (radz.), 11—15.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Daleka jest droga" (polski), 10—11. „Raj na ziemi" (polski), 12—13, „Album polski" (polski), 14—15.

Мельнік
„Niezawodni przyjaciele" (rumuński), 10—11. „Znicz olimpijski" (polski), 12—13. „Wujaszek Wania" (radz.), 14—15.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Lampy naftowe" (czeski), „100 karabinów (USA), 11—15.

Новы Двор
„Ballada o Cable u Hugue'u" (USA), „Siedem dziewcząt kaprala Zbrujewa" (radz.), 11—15.



Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł., półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch" Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40%.

BZGraf. Nakład 8 102 K-1

НЯМА ЧАСУ

Ад самага Новага года лекар Дудачка ўнікае сустрэч з хворымі. Таму і на работу ходзіць кожны дзень іншаю дарогай, перадзяваецца, кульгае на левую нагу і носіць цёмныя акуляры, каб яго ніхто не пазнаў.

Але гэта не памагае.

Дудачку ўсё роўна перапыняюць на вуліцы, пазнаюць і хуценька пачынаюць расказваць, што баліць.

Лекар выкручваецца. Тлумачыць, што ў яго няма часу і яму цяпер сапраўды не да хворых. Сяк-так выкруціўшыся, пускаецца наўцёкі.

Маладыя яшчэ нейк разумеюць яго, а са старымі проста гора. Ад іх не ўдаецца так лёгка ўцячы. Яны быццам не ведаюць, што значыць няма часу. Дзе папала чапляюцца, адбіраюць каштоўны час. Хочаш — не хочаш, а даводзіцца проста на хаду аглядаць якую-небудзь бабулю і на хаду ж выпісваць рацэпт. Спыняцца нельга: утворыцца чарга.

Проста жах!

У бальніцы — тая ж самая гісторыя. Нельга з'явіцца ў калідоры, каб не натрапіць на хворых. Раней іх быццам менш было...

Дудачка хітруе. Ён адсылае ўсіх да калегі Мілаванавай, хоць і ведае, што ёй таксама няма калі займацца хворымі. Да таго ж Мілаванава хаваецца недзе так, што яе ўжо некалькі дзён ніхто не бачыў.

Нічога не зробіш: цяпер у бальніцы ўсім — няма часу.

Дудачка па некалькі разоў на дзень мяняе кабінеты, каб збіць з панталыку тых, што яго шукаюць. Завешвае вокны шторамі, на тэлефонныя званкі адказвае змененым голасам: Дудачка, маўляў, выйшаў і наўрад ці вернецца. Дарма.

На яго чатуюць на кожным кроку.

Адзін хворы намагаўся пранікнуць да яго праз фортачку.

Тады Дудачка загадаў замкнуць сябе ў падвале і павесіць аб'яву, што яго няма і будзе ён не хутка. А сам узяўся за работу.

Лекар і сапраўды вельмі заняты: ужо месяц ён піша гадавую справаздачу.

Ежу яму падаюць праз акенца.

Віталій Каваль

— *Ну выслухайце мяне, Леначка!*

— *Доктар, зрабіце што-небудзь, каб муж гаварыў у сне больш выразна...*

НІЎКА

ЧВШ

— А што значаць гэтыя скарачэнні ў назвах хвароб? — пытаецца лекар-практыкант.

— Мы вырашылі берагчы нервы пацыентаў, таму і зашыфравалі іх хваробы. «І» — інфаркт міякарда, «ЗДК» — запаленне дванаццаціперснай кішкі...

— А «ЧВШ»?

— Чорт ведае што.

ПСІХААНАЛІЗ

Два псіхааналітыкі, якія прыехалі на кангрэс у Лос-Анджэлас, вяртаюцца на абед у свой атэль. У ліфце грум, усміхаючыся, гаворыць ім: «Сёння цудоўная пагода, панове...» Выходзячы з ліфту на сваім паверсе, адзін псіхааналітык пытае другога: «Цікава, што ён гэтым хацеў сказаць?»

КОЛЬКІ

— Пане доктар! Ваша лячэнне мне не памагае, я ўсё так сама дрэнна адчуваю сябе. Я хачу звярнуцца да другога лекара. Колькі я вам вінавата?

— Сорак марак, паважаная.

— Што, семдзесят марак?

— Не, не, я сказаў — шэсцьдзесят марак.

Галаваломка

Найкарацейшай дарогай дайдзіце па лабірынце да чорнага кружка.

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

...«Сардэчны чалавек», — гаварылі пра хірурга, які рабіў аперацыі на сэрцы.

...«Ён прытрымліваўся дыеты. Таму звальняў з работы тых, у чыіх выступленнях адчуваў перац.

СПАКОЙНА

— А-а-а! Што вы робіце? — запытаў пацыент у зубным кабінеце. — Вы ж вырвалі мне здаровы зуб!

— Спакойна! — адказвае лекар. — Дойдзе чарга і да хворага.

ПЬЮ РЭДКА

— Ці часта вы п'еце? — спытаў лекар у пацыента.

— Не, рэдка, але запоямі...

— Калі ж быў апошні?

— Ды яшчэ гадоў дваццаць таму!

— А калі кончыўся?.. — дапытваецца лекар.

— Дык вось жа яшчэ і дасюль цягнецца.

У наш век тэхнікі.

НАТВАРЫЛА

Мікіта стагнаў, прылегшы на гусеніцу свайго трактара.

— Ну, што ж, — памаўчаўшы, сказаў дыспетчар, — давядзецца пакінуць дома. Толькі ніяк не магу зразумець, што ў цябе за хвароба? Кашляеш?

— Не... е...

— Ну, гэта, відаць, плён гэтага замежнага грыпка.

— Ды не...е...

— Можа, ангіна?

— Ох... — цяжка дыхае Мікіта, — не адгадаеце, Сідар. Гэта ўсё работа жонкі маёй. Дваццаць пар вачэй палезлі на лоб.

— Ну-у!? — хорам трактарысты.

— Так.

— Наваражыла? — аж войкнула маладая аграномша.

Запярэчлівы ўзмах рукі.

— Біла?

— Цьфу, ты! — раззлаваўся трактарыст. — Няўжо не ясна? Жонка пайшла раніцай на работу і грошы схавала. Пахмяліцца няма за што!

Без слоў.

Былая фехтавальшчыца робіць укол.

БЕГ З ПЕРАШКОДАМІ

Бег карысны для людзей,
І таму рашыў я смела,
Бегаць па гадзіне ў дзень,
Каб не так тлусцела цела.

Толькі я свой бег пачаў,
Як для жартаў ёсць прычына.
Хтось крычыць: «Пераключай
Хуткасць першую, хлапчына!»

Рэжуць жартам без нажа:
— Адпачні! Прыляж на траўку!
— Малайчына, не зважай!
— Націскай на ўсе застаўкі!

Толькі бабка мой прэстыж
Бараніць рашыла, зрэшты:
«Без бяды не пабяжыш,
Пэўна здарылася нешта».

Я да жартаў не прывык,
Прыбаўляю крок па кругу.
Раптам нейкі жартаўнік
Закрычаў: «Лаві зладзюгу!»

Цэлы крос улёг за мной
(Чалавек, відаць, за трыста).
Завяршылі фініш свой
Мы ў міліцыі ўрачыста.

Але як там ні было,
Хоць не лёгка давялося,
Ды за тое тры кіло
Скінуў я на гэтым «кросе».

Юрый Благаў

Курёзы

АСЦЯРОЖНА — ПАЦЫЕНТ!

Сэнфард Шугармэн, зубны ўрач у горадзе Буфало (штат Нью-Йорк), не меркаваў, што чарговы пацыент, які нясмела ўвайшоў у яго кабінет і з апаскай сеў у крэсла, павядзе сябе такім нечаканым чынам. Калі была пушчана бормашына і ўрач пачаў свае абавязкі, пацыент Міраш Валай адчуў боль, накінуўся на свайго «мучыцеля» з кулакамі.

Гарадскі суд прыгаварыў яго да грашовага штрафу.

ВЫПАДАК НА ПЛЯЖЫ

Нядаўна жыхары парагвайскай сталіцы Асунсьёна праводзілі нядзельны дзень ва ўлюбёным месцы адпачынку на беразе возера Іпакараі. Многія бяспечна купаліся, як раптам пачалася паніка. Семнаццаць чалавек былі адпраўлены ў бальніцу пасля таго, як на купальшчыкаў напалі маленькія рыбкі піраньі. Гэтых рэдкіх драпежніц даўно ўжо не сустракалі ў абжытых раёнах краіны, але пасля трапічных ліўняў піраньі праніклі ў возера разам з водамі дробных горных рэчак. Нягледзячы на свае невялікія памеры — каля 30 сантыметраў, — піраньі нападаюць не толькі на жывёлу, але і на людзей.

ЗАСТРАХУЙЦЕСЯ ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

Перад апошнімі выбарамі ў італьянскі парламент адно страхавое таварыства страхавала на 50 тысяч лір усіх кандыдатаў, якія хацелі ўсцерагчыся ад ускладненняў, звязаных з «перадвыбарным рызыкам». У паняцце «перадвыбарнага рызыка» ўваходзілі такія непрыемнасці, як «нападзенне на кандыдата прыхільнікаў апазіцыйных групіровак», «жалудачна-кішачныя расстройствы пасля наведвання рознага роду афіцыйных абедаў, прыёмаў і банкетаў» і, урэшце «пасля ўздзеяння празмерных доз супакойваючых лякарстваў».

Смяёмся з намі

У кожнага чалавека хапае сіл, каб падарваць уласнае здароўе.